ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЕРАДА, 22 ЧЭРВЕНЯ 1938 г. № 34 (376)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ

19 чэрвеня адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі, выбранага XVII з'ездам КП(б)Б. У рабоце пленума прыняў удзел сакратар ЦК ВКП(б) тав. АНДРЭЕЎ А. А.

Пленум выбраў сакратарамі ЦК КП(б)Б тав. ПАНАМАРЭНКА П. К. і тав. АНАНЬЕВА А. А.

Членамі бюро ЦК КП(б)Б пленумам выбраны таварышы ПАНАМАРЭНКА П. К., АНАНЬЕЎ А. А. КАВАЛЕЎ А. Ф., НАТАЛЕВІЧ Н. Я., НАСЕДКІН А. А., ЛЯВІЦКІ А. М., РЭПІНСКІ М. Я., КАВАЛЕЎ М. П., ГОЛІКАЎ Ф. І.

Кандыдатамі ў члены бюро ЦК КП(б)Б выбраны таварышы МАРКІН Д. Ф., МАТВЕЕЎ А. П., ЯКУШАВА Т. І., КАВАЛЬКОЎ І. Д.



Феонія Архіпаўна НОВІКАВА, загадчык Аддзелам школ і навукі ЦК КП(б)Б — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе гор. Горак.



Міхаіл Емельянавіч ГЕРМАН, другі сакратар Гомельскага гаркома КП(б)Б— кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Варашылаўскай выбарчай акрузе гор. Гомеля.



Вера Філіпаўна ХАРЛАНАВА, сакратар Клімавіцкага РК КП(б)Б — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Клімавіцкай сельскай выбарчай акрузе.



Аляксей Фёдаравіч ЦВЯТКОЎ, начальнік палітаддзела Беларускай чыгункі— кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Жлобінскай выбарчай акрузе.

УСЕ НА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР!

Праз некалькі дзён адбудуцца выбары ў Вярхоўны Совет БССР. Гераічны беларускі народ будзе галасаваць за самага дарагога і любімага чалавека, прадаўжальніка вялікай справы Маркса, Энгельса, Леніна — геніяльнага Сталіна і яго слаўных саратнікаў, членаў Палітбюро — таварышоў Молатава, Калініна, Варашылава, Кагановіча, Жданава, Ежова, Андрэева, Мікаяна.

Беларускі народ абярэ сваім першым дэпутатам таго, каму інтарэсы рабочага класа, інтарэсы народа, прагрэс, развіццё чалавечага грамадства даражэй за ўсё, — абярэ вялікага Сталіна.

Працоўныя Совецкай Беларусі пашлюць пасланцамі ў Вярхоўны Совет БССР лепшых сваіх сыноў і дачок, загартаваных у барацьбе за пабудову соцыялізма, здольных весці барацьбу за пабудову, новага, комуністычнага грамадства.

Наш народ адзінадушна прагаласуе за кандыдатаў у дэпутаты, вылучаных сталінскім блокам комуністаў і беспартыйных, за людзей, якія, не шкадуючы сіл, а калі трэба і жыцця, вядуць барацьбу за росквіт нашай соцыялістычнай радзімы.

Галасуючы за натхніцеля і арганізатара соцыялістычнага будаўніцтва, правадыра і настаўніка працоўных усяго свету І. В. Сталіна, за баявых саратнікаў генія прагрэсіўнага чалавецтва — членаў Палітбюро, за адданых сыноў партыі і народа — кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, гэтым самым мы будзем галасаваць за вялікую партыю Леніна—Сталіна.

Аддаючы галасы за выхаваных партыяй Леніна—Сталіна партыйных і непартыйных большэвікоў, за верных сыноў і дачок народа, гэтым самым мы паскараем пераможны рух наперад, у светлае заўтра, к комунізму.

Совецкія пісьменнікі і працаўнікі совецкага мастацтва! Застаюцца лічаныя дні да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Аддадзім усе свае сілы і здольнасці, увесь свой талент на служэнне партыі і народу. Будзем уласцівымі нам мастацкімі сродкамі агітаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Падвоім і патроім, падзесяцерым нашу пільнасць з тым, каб дапамагчы нашай любімай комуністычнай партыі, нашай слаўнай совецкай разведцы спапяліць гнёзды і выкурыць з совецкай зямлі нянавісных, трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх чорных груганоў.

Ачысцім нашу соцыялістычную зямлю ад шалёных шакалаў — агентаў сусветнай фашысцкай зграі, ад агіднейшых іудствуючых падгалоскаў, трацкісцка-бухарынскіх ублюдкаў, чорных здраднікаў і шпіёнаў, якія аднялі ў нас генія магутнай рускай культуры А. М. Горкага, якія спынілі багатырскія сэрцы вялікіх комунараў С. М. Кірава і В. Р. Менжынскага, гэтых благароднейшых рыцараў рэволюцыі.

Ніякай літасці ворагу! За смерць любімейшых нам людзей, якія палі афярай ад паганай крывавай рукі, размажым сабачыя галовы ўсім трацкісцка-бухарынскім і нацыянал-фашысцкім падгалоскам, якія даўно страцілі ўсялякае чалавечае аблічча, якія даўно прынялі звярынае аблічча ашалеўшага фашысцкага зброду.

Совецкія пісьменнікі і працаўнікі совецкага мастацтва! У дзень усенароднага свята выбараў у Вярхоўны Совет БССР — усе на выбарчыя ўчасткі. Разам з нашым народам прагаласуем за верных сыноў, патрыётаў нашай радзімы — першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы. Створым кніжку «Выбары ў Вярхоўны Совет БССР».

Песняры і музыканты! Праслаўляйце ў песнях мужных салдатаў рэволюцыі, адданых сыноў партыі і народа, кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Актора і актрысы! У дзень выбараў першага соцыялістычнага парламента арганізуйце на плошчах, у дамах мастацкія выступленні, дапамажыце нашай самадзейнасці ў справе арганізацыі вольнага часу выбаршчыкаў.

Армія працаўнікоў совецкай літаратуры і мастацтва ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, у цэлым, прарабіла вялікую работу. Аднак, паасобныя ўчасткі, асабліва кіно-хроніка і Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, злачынна адстаюць. Кіно-хроніка не забяспечыла своечасовага выпуску карцін, якія-б дапамагалі ў справе агітацыі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, а Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, разам з Белсаюзфото, спазнілася з выпускам плакатаў пра кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Партыйныя, комсамольскія і асабліва профсаюзныя арганізацыі фронта мастацтваў, не гледзячы на тое, што засталіся лічаныя дні да выбараў, усё яшчэ слаба працуюць на выбарчых участках. Слаба пастаўлена агітацыйна-прапагандысцкая работа. Неабходна паслаць усе лепшыя сілы на выбарчыя ўчасткі з мэтаю правядзення як масавых мерапрыемстваў, так і работы з паасобнымі выбаршчыкамі.

Совецкія пісьменнікі і працаўнікі совецкага мастацтва! Прымем усе меры для таго, каб дапамагчы нашай партыі ў правядзенні выключнай важнасці кампаніі выбараў. Неабходна дабіцца стопроцантнай яўкі на выбарчыя ўчасткі для галасавання за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Усе на выбары ў Вярхоўны Совет БССР!

Няхай жыве магутная, непераможная Усесаюзная комуністычная партыя (большэвікоў) — кіраўнік і арганізатар вялікай соцыялістычнай будоўлі!

Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт ВКП(б)!

Няхай жыве наш мудры правадыр, бацька і настаўнік, родны і любімы Сталін!

ЯНКА КУПАЛА

А Я ДУМАЎ...

А я думаў, сонца да нас не загляне!..
Гора хадзіла ад хаты да хаты,
Пела жалейка бяду на кургане,
Слепнулі вочы з няволі праклятай.

Рэдкае град вымалачваў калоссе,
Слёзы, нядоля—на печы, у сенях,
Густа жабрацтва па сёлах паслося,
Плесня, сухоты цвілі ў сутарэннях.

Помню я гэтыя жудкія часы,
Помняць былое Расіі народы,
Помняць бацькі і дзяды па калгасах,
Помняць бацькі і дзяды па заводах,

І я памыліўся. Бясстрашных не ўстрашыў
Трон златаверхі, сатрапаў малітвы,—
Голасна коні заржалі на пашы,
Гвардыі смелых памчалі на бітвы.

Біліся доўга. У славе палеглі
Тысячы, можа, а, можа, і болей.
Войскі варожыя з бойкі пабеглі,
Густа крывёй залізаючы поле.

Ворага выгналі, волю здабылі,
У гразь патапталі кароны і троны.
Весела трубы ў Крэмлі затрубілі,
Сцягі ўзвіліся, як макі, чырвона.

Горад шчаслівы, шчаслівыя сёлы,
Ллюцца крыніцы з вясновых прагалін.
Шчыра, ад сэрца з усмешкай вясёлай
Волю і шчасце гадуе нам Сталін.

Менск, 28-V-1938.

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ XVII З'ЕЗДА КП(б)Б

У РАБОЦЕ З'ЕЗДА ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ САКРАТАР ЦК ВКП(б) таварыш А. А. АНДРЭЕЎ

18 чэрвеня адбылося заключнае пасяджэнне XVII з'езда КП(б)Б.

У рабоце заключнага пасяджэння з'езда прыняў удзел і выступіў з кароткай прамовай пёпла сустрэты ўсімі дэлегатамі з'езда сакратар ЦК ВКП(б) таварыш А. А. Андрэеў.

З'езд заслухаў паведамленне старшыні шчотнай камісіі тав. Рэпінскага аб выніках тайнага галасавання.

Пасля зачытання спіса нованыбранага склада пленума ЦК КП(б)Б і рэвізійнай камісіі з'езд з выключнай увагай заслухаў тэкст адказнай прывітальнай тэлеграмы XIV з'езда КП(б) Украіны.

Чытанне прывітальнай тэлеграмы суправаджалася бурнымі апладысментамі, воклічамі «ура» ў гонар вялікага Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў, у гонар комуністычнай партыі (большэвікоў) Украіны і ўсяго гераічнага совецкага народа.

З вялікім натхненнем з'езд прыняў прывітальнае пісьмо правадыру партыі і народаў — вялікаму і роднаму таварышу Сталіну. Чытанне пісьма ператварылася ў магутную дэманстрацыю згуртаванасці большэвікоў Беларусі вакол ленінска-сталінскага ЦК ВКП(б) і адданасці вялікаму Сталіну. З'езд стоячы вітае вялікага генія чалавецтва, арганізатара перамог соцыялізма, роднага і любімага таварыша Сталіна. З усіх канцоў залы нясуцца воклічы «Няхай жыве наш родны Сталін!», «Вялікаму Сталіну ура!». Пад бурную авацыю у гонар вялікага Сталіна і спевы «Інтэрнацыянала» XVII з'езд КП(б)Б закончыў сваю работу.

Склад членаў пленума ЦК КП(б)Б, выбраных XVII з'ездам КП(б)Б

АНАНЬЕЎ А. А.,	КЛІМОВІЧ А. В.,	ОЧКАСАЎ А. І.,
АНІСКАВЕЦ В. Т.,	КАВАЛЕЎ М. П.,	ОСТРОЎСКАЯ М. М.,
АКІМАЎ С. Д.,	КІСЯЛЕЎ К. В.,	ПАНАМАРЭНКА П. К.,
БЕДЗІН В. В.,	КАРОВІН І. С.,	ПАСТУХОЎ Ф. І.,
БЕЛЯЕЎ С. М.,	КУЛІКОЎ С. Д.,	ПЕТРОЎ М. П.,
БРЫКАЎ А. Д.,	ЛЯВІЦКІ А. М.,	ПІГУРНОЎ А. П.,
ВАЛЧКОЎ Е. К.,	ЛАБАНОК А. Б.,	РЭПІНСКІ М. Я.,
ВАСІЛЬЕЎ І. В.,	ЛОДЫСЕЎ С. Т.,	РАМАНЕНКА С. М.,
ГУСЕЎ Д. С.,	МАЛЕНКОЎ Г. М.,	СВІНЦОЎ А. А.,
ГЕРМАН М. Е.,	МЕХЛІС Л. З.,	СУБОЦІН Т. Ф.,
ГУЦЭЎ У. А.,	МАСЛЕННІКАЎ І. І.,	САЛАБУЦІН В. Т.,
ГОЛІКАЎ Ф. І.,	МІКУШЫН Г. Н.,	САВІЦКІ П. П.,
ГОРЭЎ К. В.,	МАТЛАХОЎ Д. А.,	СМОЛЯР В. П.,
ЖЫЛЯНІН Я. А.,	МАТВЕЕЎ А. П.,	ТЕРЭХАЎ І. Ф.,
ЖДАНЬКОВА А. І.,	МАРКІН Д. Ф.,	ТРАГЕР Г. І.,
ІГАЕЎ С. С.,	МАКСІМАЎ Д. К.,	УРАЛАВА Е. І.,
ІВАНОЎ Н. І.,	МЕЛЬНІКАЎ С. П.,	ХАРЛАНАВА В. Ф.,
КАВАЛЕЎ А. Ф.,	НАСЕДКІН А. А.,	ШЛІФЕНСОН С. І.,
КАВАЛЬКОЎ І. Д.,	НЕБЫШЫНЕЦ Н. Е.,	ШЧЭБЕТАЎ С. Я.,
КУЛАГІН М. В.,	НАСКОЎ П. А.,	ЮХІМЧУК І. І.,
КУДЗІНОВІЧ І. М.,	НАТАЛЕВІЧ Н. Я.,	ЯКАВІЦКІ В. В.,
КАРАТКЕВІЧ Д. А.,	НОВІК С. Я.,	ЯКУШЭВА Т. І.

Склад кандыдатаў у члены пленума ЦК КП(б)Б, выбраных XVII з'ездам КП(б)Б

ДЗМІТРЫЕЎ В. І.,	ШЭКЛАНАЎ І. П.,	СПАСАЎ П. С.,
МАЛЬЦЭЎ С. І.,	КАВАЛЕЎ П. Е.,	БЫЛІНСКІ В. П.,
КРАСНАШЭЕЎ І. І.,	КАЎФМАН З. І.,	ГРЭК Н. Г.,
ЗАХАРАЎ С. А.,	ЦУРБАНАЎ Д. Л.,	ЕРМАК А. В.,
ЯГОДКІН В. М.,	КАЗАЧОНАК Г. С.,	МАЦЮШКА В. Ф.,
ЕРМАКОЎ В. К.,	ШЫБАЛКА В. Г.,	ШМУРАТКА А. Е.,
МАРОЗАЎ С. І.,	ГАНЧАРОЎ К. Д.,	ШАХМЕТАЎ С. К.,
ВАНЕЕЎ В. Г.,		ЖУР Е. К.

Склад членаў рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б, выбраных XVII з'ездам КП(б)Б

АБУШЭНКА К. А.,	ГАЎРЫЛАЎ Ф. Г.,	МАКАРАЎ І. Н.,
БАЧЭЎСКІ В. А.,	ЛЕВІН Н. Г.,	СЕДЫХ В. Я.,
БАГАМОЛАВА Е. П.,	ЛІТВІНАВА Л. М.,	ТУР І. П.

СУСТРЭЧА ВЫБАРШЧЫКАЎ СА СВАІМ КАНДЫДАТАМ М. І. КАЛІНІНЫМ

ЛЕНІНГРАД, 20 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння ў 4 гадзіны дня рабочыя, служачыя, інжынеры і тэхнікі завода «Севкабель» сабраліся на перадвыбарчы мітынг, прысвечаны сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР па Свердлоўскай выбарчай акрузе Міхаілам Іванавічам Калініным. Звыш 2000 выбаршчыкаў сабралося на гэту незвычайную сустрэчу.

З'яўленне ў прэзідыуме Міхаіла Іванавіча Калініна сустрэта доўга незмаўкаючай авацыяй.

Мітынг адкрыў беспартыйны інжынер завода тав. Кароўкін.

Першым атрымлівае слова стары рабочы чацвертага цэха тав. Карнееў.

— Сёння ў нас вялікая радасць,— сказаў ён.—Мы асабіста вітаем у сябе нашага дарагога кандыдата, стойкага барацьбіта за справу рабочага класа— Міхаіла Іванавіча Калініна.

Пад бурныя апладысменты тав. Карнееў заклікае ўсіх выбаршчыкаў галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, а выбаршчыкаў Свердлоўскай выбарчай акругі за слаўнага кандыдата—Міхаіла Іванавіча Калініна.

Беспартыйны інжынер тав. Хайкін у сваім выступленні горача вітаў блізкага саратніка вялікага Сталіна — Міхаіла Іванавіча Калініна і заклікаў сустрэць дзень выбараў мабілізацыяй усіх сіл на выкананне вытворчай праграмы.

Ад імя комуністычнай арганізацыі завода выступіў сакратар парткома завода тав. Ігонін, ад калектыва другога цэха—начальнік цэха тав. Губіеў. У сваіх выступленнях яны заклікалі выбаршчыкаў галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, галасаваць за вернага саратніка таварыша Сталіна — Міхаіла Іванавіча Калініна.

У заключэнне з вялікай прамовай выступіў сустрэты доўга незмаўкаючымі апладысментамі Міхаіл Іванавіч Калінін.

Таварыш Калінін гаварыў аб комуністычнай партыі—авангардзе рабочага класа, аб вялікім правадыру і настаўніку ўсіх працоўных — таварышу Сталіне, аб радасным, шчаслівым жыцці народаў СССР.

Калектыў завода «Севкабель» прыняў рэзалюцыю, у якой вітае свайго кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР і заклікае выбаршчыкаў Свердлоўскай выбарчай акругі галасаваць за Міхаіла Іванавіча Калініна.

Пасля сходу М. І. Калінін наведаў цэхі завода.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышу І. В. СТАЛІНУ

Родны наш Іосіф Вісарыёнавіч!

Вам, геніяльнаму прадаўжальніку справы вялікага **Леніна**, мудраму правадыру і настаўніку нашай слаўнай большэвіцкай партыі, любімаму бацьку і другу беларускага народа, натхніцелю і арганізатару найвялікшых перамог соцыялізма, правадыру прыгнечаных усяго свету — большэвікі Беларусі, сабраўшыся на свой XVII з'езд, шлюць ад усяго сэрца палкае большэвіцкае прывітанне.

Узброеныя рашэннямі лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і на аснове Вашых, таварыш Сталін, указанняў, большэвікі Совецкай Беларусі разграмілі і знішчаюць варожыя гнёзды трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных бандытаў.

Гэтая барацьба з ворагамі народа з'явілася велізарнай школай большэвіцкага выхавання нашых партыйных радоў, і работа нашага з'езда паказала, што большэвікі Совецкай Беларусі, як ніколі, зараз ідэйна згуртаваны вакол нашага ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), гатовы да канца абараняць і адстойваць сталінскія пазіцыі барацьбы за партыю, за ўмацаванне магутнасці соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, рашуча і да канца змагацца з усімі ворагамі народа.

Прэзрэнныя ворагі народа — трацкісты, бухарынцы, буржуазныя нацыяналісты—усё рабілі для таго, каб нашкодзіць нашай партыі, каб прадаць нашу радзіму, прадаць шчаслівы беларускі народ фашыстам. І толькі дзякуючы Вашай, таварыш Сталін, пільнасці і няспыннай зоркасці выхаваных Вамі нашых слаўных чэкістаў не ўдалося гэтым прэзрэнным гадам ажыццявіць свае каварныя замыслы. Вось чаму большэвікі Беларусі ад імя ўсяго беларускага народа з любоўю прыносяць Вам сваю ўдзячнасць.

Совецкая Беларусь, якая ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-калгасную рэспубліку, стаіць грозным, непрыступным фарпостам пераможнага соцыялізма, роўная сярод роўных совецкіх рэспублік — на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Кіруемы вялікай партыяй Леніна— Сталіна, з дапамогай гераічнага рускага рабочага класа, — беларускі народ прагнаў нямецкіх акупантаў, разграміў белапалякаў, знішчыў памешчыкаў і капіталістаў і з усімі народамі нашай вялікай радзімы, сагрэты Вашай любоўю і пастаяннымі клопатамі заваяваў і пабудаваў шчаслівае і радаснае жыццё. І ніякая варожая сіла ніколі не зможа адняць гэтыя найвялікшыя заваяванні.

Беларускаму народу аказана вялікае давер'е тым, што Вы, таварыш Сталін, і Вашы бліжэйшыя саратнікі таварышы Молатаў, Калінін, Варашылаў, Кагановіч, Андрэеў, Мікаян, Ежоў, Жданаў далі згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР. І мы гэтае давер'е з гонарам апраўдаем. Мы абяцаем Вам, Іосіф Вісарыёнавіч, высока трымаць сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, яшчэ мацней згуртуем наш народ вакол комуністычнай партыі, яшчэ больш умацуем блок комуністаў і беспартыйных, на аснове якога беларускі народ на выбарах у свой соцыялістычны парламент яшчэ раз прадэманструе сваю беззаветную любоў і адданасць да нашай баявой комуністычнай партыі **Леніна—Сталіна**, сваё маральна-палітычнае адзінства і непарушную дружбу з рускім народам і з усімі народамі вялікага Совецкага Саюза.

Большэвікі Совецкай Беларусі працуюць у рэспубліцы, якая граніцыць з капіталістычным Захадам, і мы разумеем, якую вялікую задачу ставіць перад намі, перад нашым народам наша партыя **Леніна—Сталіна**, наш совецкі ўрад. Мы запэўняем Вас, таварыш Сталін, запэўняем наш Цэнтральны Камітэт і ўсю нашу партыю ў тым, што прыкладзем усе нашы сілы да таго, каб яшчэ больш мацаваць абаронную магутнасць Совецкага Саюза, будзем нястомна ўмацоўваць боездольнасць нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і выканаем Вашы ўказанні аб тым, каб нястомна павышаць мабілізацыйную гатоўнасць працоўных Совецкай Беларусі. І калі ворагі пасмеюць пасягнуць на нашы свяшчэнныя граніцы, беларускі народ, разам з усімі народамі нашага неабсяжнага Совецкага Саюза, у любую мінуту гатовы разграміць ворага на яго тэрыторыі.

Закрываючы XVII з'езд і падводзячы вынікі работы за прайшоўшы год і, у першую чаргу, адзначаючы поспехі па разгрому і знішчэнню ворагаў народа, мы, разам з тым, памятаем аб велізарных задачах, якія стаяць перад нашай партыяй. Мы разумеем, што разгромлены асіныя гнёзды ворагаў народа, але яшчэ асталіся іх прэзрэнныя наследышы. Таму Вашы ўказанні, даныя нашай партыі на лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) — аб авалоданні большэвізмам, аб нястомным павышэнні большэвіцкай пільнасці, — былі, ёсць і астануцца баявой праграмай работы для комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. Мы запэўняем Вас, таварыш Сталін, і ў Вашай асобе — Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і ўсю нашу партыю, што і надалей будзем бязлітасна выкрываць і знішчаць ворагаў народа, прадажнікаў, здраднікаў і шпіёнаў, якой-бы лічынай яны ні прыкрываліся, у якія-б шчыліны яны ні забіраліся, ліквідуючы ў самы кароткі тэрмін вынікі іх варожай работы на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

XVII з'езд КП(б)Б ад імя ўсіх большэвікоў Беларусі запэўняе Вас, таварыш Сталін, што комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі маналітна, адзіна і згуртавана і, як заўсёды, была, ёсць і будзе верным аплотам ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

Няхай жыве наша квітнеючая соцыялістычная радзіма і яе гераічны народ!

Няхай жыве сталінская дружба народаў!

Няхай жыве непераможная армія большэвікоў — наша вялікая партыя **Леніна—Сталіна!**

Няхай жыве наш мудры правадыр, настаўнік і друг Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін!**

ГАЛАСУЙЦЕ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!

ВАСІЛІЙ ПЯТРОВІЧ СМОЛЯР

Любаньскі раён—праддзвер'е Палесся, ад якога ён, паміж іншым, не так ужо і адрозніваўся. Былі і тут балоты, праўда, меней, тыя-ж пералескі, такая-ж небагатая на ўраджай зямля, як Палессе — пяскі, суглінкі, куп'яватыя сенажаці. Былі і такія-ж вёскі, як на Палессі — няўтульныя, яны не радуюць вока ні багатай зелянінай, ні вясёлымі хатамі, ні радаснымі тварамі іх жыхароў.

Доўгія асеннія ночы. Пры дымнай лучыне, за верацяном далёка за поўнач сядзелі пахмурыя жанчыны.

Вёска панура маўчыць, саламяныя стрэхі ўздзёрты халодным асеннім ветрам. Не чуваць у ёй ні гуку, ні чалавечага голасу, як быццам вымерла ўся.

Гэта мінулая любаньская вёска. Старыя, дарэволюцыйныя Юшковічы. Людзі ў ёй жылі глуха, дзіка. Без асаблівай патрэбы з вёскі не ішлі. Дзед нашага кандыдата Васілія Пятровіча Смоляра восемдзесят год пражыў, а далей трох вёрст ад вёскі не хадзіў.

Тав. Смоляр нарадзіўся ў Юшковічах у 1904 годзе. Вучыўся ў пачатковай школе, якая была ў суседняй вёсцы. Скончыў яе ў 1916 годзе. Улетку пасвіў коней, дапамагаў бацьку ў сельскай гаспадарцы. У 1915 годзе бацьку ўзялі на імперыялістычную вайну, сям'я засталася без карміцельца.

Надышла Кастрычніцкая рэволюцыя. Назаўсёды развіталіся Юшковічы з мінулай цемраддзю, з глухаманню. Новыя дні абудзілі вёску, далучылі яе да барацьбы ўсёй краіны, да барацьбы працоўных за совецкі лад, за совецкую дзяржаву. Поўны энтузіязму бярэцца і тав. Смоляр за актыўную палітычную і грамадскую работу ў вёсцы. З 1923 года ён быў сакратаром і старшынёй расельсовета, знаходзячыся на нізавой рабоце да 1927 года. У 1925 годзе ўступае ў комсамольскую арганізацыю, актыўна працуе сярод сялянскай моладзі, з 1927 года працуе на раённым пункце ліквідацыі непісьменнасці, у 1928 годзе вылучаецца сакратаром райвыканкома. Грамадская і палітычная работа наблізіла тав. Смоляра да нашай комуністычнай партыі, і ў 1927 годзе ў мястэчку Любань ён прымаецца ў кандыдаты партыі, а ў наступным годзе пераводзіцца ў члены партыі.

У 1929 годзе яго пасылаюць на работу ў вёску Таль у якасці сакратара партыйнай ячэйкі. Быў пачатак вялікага пералому ў вёсцы, пачатак масавага калгаснага руху.

Вясна 1930 года. Яна асабліва памятна тав. Смоляру напружанай работай па арганізацыі калгасаў, вострай барацьбой з кулацтвам, якое праводзіла падрыўную работу, імкнулася да зрыву вялікага плана калектывізацыі. Калі ў вёсцы Таль арганізаваўся першы калгас, кулакі мабілізавалі ўсе сілы на яго развал, на процідзеянне рабоце партыі і совецкай улады на вёсцы. Спачатку яны спадзяваліся, што з калгаснай справы нічога не выйдзе, што бедната не справіцца з зямлёй, не маючы ні добрай жывёлы, ні спраўных плугоў, ні адной больш-менш прыгоднай машыны. Але вось прыбылі ў калгас першыя сталінскія машыны, два трактары. За кароткі час была ўзнята велізарная плошча зямлі. Заварушыліся кулакі, убачыўшы, што калгасная справа пашыраецца, становіцца на моцныя большэвіцкія ногі. І чаго толькі не рабілі яны — запалохвалі людзей, пагражалі, ледзь не арганізавалі сапраўднае кулацкае паўстанне. Але калгасны рух апракінуў усе кулацкія перашкоды, кулакі былі перамохаваны канчаткова і беспаваротна. У гэтай барацьбе з кулацтвам вялікую ролю адыграла партыйная ячэйка, у якой працаваў тав. Смоляр.

У 1930 годзе Васілій Пятровіч вучыцца на кароткатэрміновых прапагандысцкіх курсах пры ЦК КП(б)Б і па сканчэнні іх накіроўваецца на работу прапагандыста ў Талачынскі раён, дзе адначасова ён быў і старшынёй мясцкома работнікаў асветы.



З 1931 года тав. Смоляр пасылаецца на вучобу ў Менск у Вышэйшую сельскагаспадарчую комуністычную школу, якую ён канчае ў 1934 годзе і застаецца там-жа намеснікам сакратара парткома. З часу арганізацыі горрайкомаў у Менску прызначаецца інструктарам Сталінскага райкома партыі. З райкома, у якім звілі сабе гняздо падхалімы і ўгоднікі, быў літаральна выжыты людзьмі, якія аказаліся потым ворагамі народа.

З красавіка 1936 года тав. Смоляр быў сакратаром парткома Інстытута народнай гаспадаркі. З кастрычніка 1937 года абіраецца сакратаром Сталінскага райкома партыі. На Менскай раённай партыйнай канферэнцыі гэтага года абіраецца аноў першым сакратаром райкома.

Такі шлях большэвіка Смоляра, які нарадзіўся ў глухой вёсцы дарэволюцыйнай Беларусі. Ен рос разам з ростам сваёй краіны, з ростам свайго беларускага совецкага народа, дапамагаючы яму і вучачыся ў яго. Змянілася і аблічча роднай вёскі, якая знайшла ў калгасе канчатковае вызваленне ад ідыятызма вясковага жыцця, ад яго былой замкнёнасці, глухамані, старой забітасці. У вёсцы ёсць свая школа, Юшковічы жывуць поўнакроўным, шчаслівым, заможным калгасным жыццём. Перад яе людзьмі адкрыты ўсе дарогі ў свет, самыя шырокія магчымасці для найбольш разумнага і поўнага выкарыстання сваіх сіл і здольнасцей на карысць совецкага народа. Гэта можна прасачыць і на сям'і, з якой выйшаў тав. Смоляр. Адзін брат служыць малодшым камандзірам у Чырвонай Арміі. Другі брат вучыцца ў Менскім медыцынскім інстытуце, сястра вучыцца на рабфаку.

Працоўныя Сталінскай выбарчай акругі гор. Менска вылучылі тав. Смоляра сваім кандыдатам у Вярхоўны Совет БССР. І яны ўпэўнены, што Васілій Пятровіч, варты сын беларускага совецкага народа, узрошчаны і выхаваны комуністычнай партыяй і народам, будзе з гонарам несці абавязкі слугі народа, абавязкі дэпутата першага соцыялістычнага парламента нашай рэспублікі.

Міхась ЛЫНЬКОЎ.

БУДЗЕ ПЕРШЫМ ДЭПУТАТАМ НАШ ЛЮБІМЫ СТАЛІН

(Выбарчыя частушкі)

Лейся, песня удалая,
Грымі, музыка пабед,
Выбіраць мы хутка пойдзем
У Вярхоўны наш Совет.

Асіпавіцкі раён.

Дзякуй Сталіну радному,
Што ён вывеў нас на свет,
Яго першым дэпутатам
Выбіраем у Совет.

Оршанскі раён.

Сталін — сонейка над полем,
Сталін — родны бацька нам,
З шчырай радасцю свой голас
Я за Сталіна аддам.

Любаньскі раён.

Пабудуем клуб мы новы,
Наш калгас багаты,
Выбярэм мы Сталіна
Ад нас дэпутатам.

Асвейскі раён.

Усе ведаюць цяпер,
Што мы моцны сталі;
Першым будзе дэпутатам
Наш любімы Сталін.

Рэчыцкі раён.

Радасць сэрца абдымае,
Песня рвецца з грудзей:
У Совет мы выбіраем
Лепшых сталінскіх людзей.

Асіпавіцкі раён.

Мы жывём ў краіне роднай
Весела, багата.
Будзе Молатаў любімы
Нашым дэпутатам.

Чачэрскі раён.

Надыходзіць для ўсіх нас
Свята ўсенароднае,
Абярэм мы дэпутатам
Калініна роднага.

Асвейскі раён.

У нас на вуліцы і дома
Электрычны гарыць свет;
Мы Ежова выбіраем
У Вярхоўны наш Совет.

Лельчыцкі раён.

У куточку на сцяне
Варашылава партрэт,
Выбіраем Варашылава
У Вярхоўны мы Совет.

Менскі раён.

Ты іграй, іграй, гармонік,
А мы хорам падпяём,
Дэпутатам у Совет мы
Наталевіча пашлём.

Любаньскі раён.

Раней я была батрачкай,
Быў не міл мне белы свет,
Цяпер мяне дэпутаткай
Выбіраюць у Совет.

Любаньскі раён.

Раней шчасця мы не зналі,
Быў закрыт нам белы свет,
А цяпер мы выбіраем
У Вярхоўны наш Совет.

Чачэрскі раён.

Колькі радасці і шчасця,
Нельга словам перадаць:
Мне ўжо сёння восемнаццаць,
Маю права выбіраць.

Крычаўскі раён.

Ой, пайду я ў луг зялёны,
Буду песенькі спяваць,
Бо настаў дзянёк вясёлы,
Маю права выбіраць.

Асіпавіцкі раён.

Усе на выбары пайдзём,
Бо шчасліва мы жывём,
Бо багацце наша ў нас,
Бо жыццё нам даў калгас.

Асіпавіцкі раён.

Мы за ленінскую славу
Будзем смела ўсе стаяць,
І за сталінскую справу
Будзем ўсе галасаваць.

Оршанскі раён.

ІОСІФ ІВАНАВІЧ ПАПКОЎСКІ

Роўна ў 5 гадзін раніцы з невялічкага гаража зухавата вылятае досыць патрапаны «фордзік». Спыніўшыся толькі на момант, каб даць усесціся старшыні райвыканкома Іосіфу Іванавічу Папкоўскаму, машына з шумам і грукатам імчыцца па ціхіх і сонных яшчэ вуліцах мястэчка. Прамільгаюць міма толькі-што збудаваныя яслі — цудоўны мураваны будынак; велізны, у засені стагодніх дрэў, кінотэатр; новы рэстаран; шырокія вітрыны магазінаў.

Адразу за мястэчкам пачынаюцца шырокія калгасныя палі. Пасля нядаўняга дажджу дружна рванулі ў рост усходы ярыны. Буйная ранішняя раса палісквае ад сонца на цёмна-зялёным пер'і ячменю. Густою сцяною ўздымаецца ўскрай дарогі жыта. У нізінах, пад лёгкай дымкай туману, разгортваюцца прасторы мурожных сенажацей. Багаты сёлета павінен быць працадзень!

— Завернеш раней у брыгаду, — гаворыць Іосіф Іванавіч шоферу. — Адтуль — да старшыні калгаса.

Так, роўна ў 5 гадзін раніцы, пачынаецца працоўны дзень старшыні Уздзенскага райвыканкома. Пачынаецца не ў цішыні габінета, сярод сухога шолаху папер, а ў брыгадах — на полі, непасрэдна там, дзе ідзе ўпартая барацьба за высокі сталінскі ўраджай.

Сказаць праўду, знайшліся былі сярод калгасных кіраўнікоў і такія, якія не вельмі спяшаліся з работай. Аднойчы Іосіф Іванавіч запытаўся ў калгаснікаў, якія сеялі авёс, куды пашоў іх старшыня?

— Ды ён з хаты яшчэ не вылазіў, — усміхнуліся сейбіты. — Можа, яшчэ спіць.

— Спіць? — не паверыў Іосіф Іванавіч. — А вось мы паглядзім.

Старшыня сапраўды спаў. Ен зусім не спадзяваўся, што да яго можа хтонебудзь прыехаць у такое ранне. Тыя годы калі і наведваў хто калгас, дык гэта рабілася ўдзень альбо пад вечар. А тут—на табе...

— І трэба-ж праспаць, ліха на яго,— збянтэжана мармытаў ён, усцягваючы на правую нагу бот з левай. — Казаў жонцы, каб разбудзіла...

— А ты мяне, а не каго другога прасі будзіць цябе, — усміхнуўся Іосіф Іванавіч. — Тады, можа, і не заспіш. А народ у цябе харошы. Даўно ўжо на полі.

— Першы раз у жыцці, Іосіф Іванавіч, — густа чырванеў старшыня калгаса.

— Ладна, ладна. Пайшлі ў свіран. Ты думаеш, што цябе калгаснікі абралі за старшыню для таго, каб ты пазней спаў?

Патрапаны, але спраўны горкаўскі «фордзік» насіў Іосіфа Іванавіча ад брыгады да брыгады, ад калгаса да калгаса. Тут-жа, на месцы, вырашаліся самыя, здавалася, складаныя і простыя пытанні, з якімі старшыні калгасаў і сельсоветаў думалі ехаць у раён: сяўба, мясапастаўкі, фінплан, дарожнае будаўніцтва. І людзі зноў імкліва кідаліся ў работу, здаволеныя, што не трэба ехаць у раён і траціць на гэта цэлыя дні.

Таму Уздзенскі раён адзін з першых па рэспубліцы скончыў веснавую сяўбу, выканаў план мясапаставак, ідзе на другім месцы ў Менскай вобласці па выкананню фінплана.

Але гэта не здавальняе Іосіфа Іванавіча Папкоўскага. Уздзенскі раён павінен быць на першым месцы па ўсіх відах работ і дзяржаўных паставак!

Кожнае раніцы імчыцца па цудоўных дарогах Уздзеншчыны вядомая кожнаму калгасніку легкавая машына. Калгаснікі здалёку пазнаюць і яе і поўнага нястомнай энергіі і жыцця чалавека.

Раве та стогне Дніпр шырокі,

Сердыты вітэр завыва...

часамі чуюць яны з машыны. Часамі бачаць яго, пасля нарады з сельсовецкім і калгасным актывам, сярод шумнай і шчаслівай совецкай моладзі. Пасвяточнаму апранутыя хлопцы і дзяўчаты кружацца ў танцах. Адна за другою мільгаюць пары. Альбо бачаць яго на калгаснай валейбольнай пляцоўцы. Звініць пад ударамі пругкі мяч. Звіняць ясныя галасы шчаслівай дзетвары наўкола. Часамі твар Іосіфа Іванавіча хмурнее. Яму ўспамінаецца яго маленства. Здаецца, блізкае, але страшна цяжкое і горкае.

Бацька Іосіфа Іванавіча, спрадвечны батрак і каваль, памёр, калі Язэпку было толькі чатыры годы. Памёр ад невасільнай катаржнай працы ў маёнтку Блонь памешчыка Асмалоўскага. Праз пяць дзён пасля пахавання каваля панскія прыганятыя выкінулі з кватэры ўдаву з чатырма дзецьмі-сіротамі.

Пачалося яшчэ больш жудаснае жыццё. Вечныя настачы хлеба, адзення, абутку. У невялічкай хацінцы бабкі, куды ўдава перабралася пасля смерці мужа, зімою часта замярзала вада. Уся сям'я спала на адным палку, накрывалася ўсякім рызззём. Вокны былі мізэрныя і ад гэтага ў хаце панаваў паўзмрок. Па вечна вільготнай земляной падлозе бегалі вёрткія сараканожкі. Хацінка стаяла на чужой зямлі, каля самага балота. У познія восеньскія ночы ў малых дзяцей бегалі мурашкі па целе ад зацяжнага і галоднага выцця ваўкоў.

Калі Язэпу споўнілася дванаццаць год, маці ўзяла яго за руку і павяла ў маёнтак графа Грабоўскага.

— Папасеш лета свіней, — гаварыла яна дарогаю. — Больш у нас хлеба будзе.

Графскія свінні былі наравістыя. Яны толькі і глядзелі, каб як уварвацца ў шкоду. Хлапец да крыві збіваў ногі, ганяючыся за імі. Лазовыя лапці ляцелі за дзень на пыл.

— Каб лыкавыя справіць, — уздыхала бабка. — Лыкавыя даўжэй носяцца. Толькі вось бяда: няма ў нас капейчыны на лыка.

— Лыка? — перапытаў Язэпка. — Я дастану!

— Кінь гаварыць глупства!

— Вось пабачыце...

І Язэпка сапраўды дастаў лыка. Толькі вельмі дорага яно яму абыйшлося.

Ен падгледзеў, што ў пышным графскім парку расце шмат маладых ліпак. Былі яны тонкія і гонкія. Дачакаўшыся ночы, Язэпка забраўся з братам у парк і ўзяўся за работу.

Хутка ад ліпак засталіся толькі белыя пеньчукі.

— І ў школу можна будзе хадзіць у такіх лапцях!—шаптаў у цемры Язэпка свайму брату Валодзю. — Ну, пайшлі.

Аканом графа як не звар'яцеў, убачыўшы белыя пеньчукі замест пышных ліпак, якія цешылі панскае вока. «Злачынцаў» хутка выявілі, збілі і прагналі, не аддаўшы ім заробленага.

Давялося Язэпку вандраваць далей па кулацкіх хутарах, бо не было сваёй зямлі, не было каровы, свіней. Улетку ён пасвіў чужы статак, баранаваў, араў, вадзіў на начлег кулацкіх коней. Зімою спрабаваў вучыцца. З вялікімі цяжкасцямі скончыў пачатковую школу.

Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя адкрыла Язэпу Папкоўскаму шырокую дарогу ў жыццё.

Ен першы з вёскі Таўкачэвічаў уступіў у 1923 годзе ў комсамол, а ўжо ў 1924 годзе сам арганізаваў комсамольскую ячэйку ў сваёй вёсцы, быў яе першым сакратаром. Толькі пасля Кастрычніцкай рэволюцыі сям'я Папкоўскіх атрымала пяць дзесяцін зямлі ад развярстання былога панскага маёнтку.

Разам з агульным ростам і развіццём нашай краіны расце і тав. Папкоўскі: спярша член сельсовета, потым сакратар райкома сельскагаспадарчых і лясных рабочых. У 1927 годзе Іосіф Іванавіч паступае на двухгадовыя настаўніцкія курсы, пасля сканчэння якіх працуе настаўнікам. Пасля — загадчык райАНА, потым культпроп райкома партыі. У гэтым годзе ў сакавіку месяцы быў абран за старшыню Уздзенскага райвыканкома. У партыі Іосіф Іванавіч з 1928 года, ён член бюро райкома двух складаў, а ў гэтым годзе абран кандыдатам у склад Менскага абласнога камітэта партыі.

Комсамол, партыя Леніна—Сталіна вырасцілі і загартавалі ў баях з класавымі ворагамі былога графскага пастушка. Праца на кулака, на памешчыка ўзгадавала ў яго сэрцы лютую нянавісць да эксплаататараў, да ўсіх ворагаў народа. Ен добра памятае старую Уздзеншчыну, у якой было толькі 13 пачатковых школ, але затое амаль у кожнай вёсцы была карчма, было тут 13 цэркваў, касцёл, 5 сінагог.

Цяпер у Уздзенскім раёне 65 школ, з іх тры дзесяцігодкі, 13 няпоўных сярэдніх школ. У раёне 13 хат-чытальняў, 42 ленінскіх куткі, 2 бібліятэкі, 3 гукавых кіно, 7 кіноперасовак. Амаль кожны калгасны двор выпісвае газеты. У многіх вёсках радыёфіцыраваны ўсе хаты калгаснікаў. На шырокіх калгасных палях працуюць трактары, жняяркі, камбайны. Рэдка цяпер, і то ўсім на дзіва, сустрэнеш у калгаснай вёсцы лапці: сяляне ходзяць у ботах, у чаравіках.

Усяго гэтага Уздзенскі раён дасягнуў пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і пры актыўным удзеле Іосіфа Іванавіча Папкоўскага, як вернага і адданага сына гэтай партыі, як гарачага патрыёта сваёй соцыялістычнай радзімы.

Таму працоўныя Лошанскай выбарчай акругі Уздзенскага раёна вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Яны добра ведаюць Іосіфа Іванавіча Папкоўскага, яны яму давяраюць.

І тав. Папкоўскі гэта вялікае давер'е народа апраўдае з гонарам.

М. ПАСЛЯДОВІЧ.

КАМПАЗІТАР, УЗРОШЧАНЫ РЭВОЛЮЦЫЯЙ

Допіс «Канцэрт-мітынг» ва ўпраўленні Заходняй чыгункі» ў гомельскай газеце чыгуначнікаў «Путь пролетария» ў заключэнне паведамляў:

...«Неабходна адзначыць удалы выбар нумароў харавога выканання. Пажадаем нашым таварышам-комуністам і мастацкаму гуртку ставіць часцей такія канцэрты, а тав. Туранкову—як мага больш даваць сваіх прачулых і прадуманых музычных навінак».

Гэта было тады, калі разам з рэволюцыяй нараджалася і самадзейнасць працоўнага народа.

...1919 год. Зіма. Чалавек сярэдняга росту, апрануты ў шэры салдацкі шынель, ішоў нацянькі, па сугробах, з горада Гомеля ў невялічкі рабочы гарадок Нова-Беліцу. Чалавек настойліва крочыў да будынка, у якім ён меркаваў сагрэцца і адпачыць. Памяшканне, у якім ён спыніўся, на вялікі жаль, не апальвалася. Шыбы былі выбіты. З усіх бакоў дзьмуў вецер. У гэтым памяшканні і сустрэўся чалавек у шынелі з культработнікам запалкавай фабрыкі «Везувій».

— А-а...—сказаў культработнік, — таварыш Туранкоў! А мы вас чакаем. І паглядзеў вакол на голыя сцены, на выбітыя шыбы, сканфужана ўхмыльнуўся.—Тут быў цэх фабрыкі. За вайну трохі разбурылі. Культработнік высунуўся ў адтуліну вакна і гукнуў інжынера. Той падышоў да вакна.

— Гэта памяшканне мы зоймем пад клуб. Ен жэстам даў зразумець, што патрэбен такі-сякі рамонт.

Калі вокны былі залатаны фанерай і ў часовым клубе адгарадзілі пакой для хора, прыйшлі першыя харысты новабеліцкай студыі. Сярод іх былі хлопцы і дзяўчаты. Старыя сумняваліся і недаверліва адносіліся да хора. Моладзь з ахвотай прыходзіла спяваць новыя, рэволюцыйныя песні.

Малады музыкант шчыра і аддана прапагандуе песні, народжаныя вялікай соцыялістычнай рэволюцыяй.

Адчуўшы вялікую цягу совецкай моладзі да мастацтва, А. Е. Туранкоў, пры дапамозе комуністаў і настаўнікаў, арганізоўвае ў 1919 годзе ў былым палацы князя Паскевіча гомельскую народную кансерваторыю. Цяжкасці яе адкрыцця аналагічны цяжкасцям стварэння першай фабрычнай харавой студыі ў Нова-Беліцы. Потым гэта кансерваторыя рэарганізуецца ў музычную школу. У 1920 годзе Туранкоў арганізоўвае харавую студыю на Палессі, пры ўчастковым палітаддзеле Заходняй чыгункі на станцыі Гомель-таварная, дзе ўдзел прымаюць чыгуначнікі. Пазней, калі ў Гомелі быў пабудаван клуб імя Леніна, ён і там стварае моцны музычны калектыў.

У 1925 годзе ў Гомелі пры актыўным удзеле Туранкова адкрываецца музычны тэхнікум. Ва ўсіх гэтых музычных установах А. Е. Туранкоў, пачынаючы з 1919 года, пятнаццаць год працуе настаўнікам.

Так, у шчыльнай сувязі з народам з першых дзён совецкай улады пачынае сваё творчае жыццё Аляксей Еўлампіевіч.

★

Каб ацаніць сёнешняе жыццё і творчасць Аляксея Туранкова, нельга не прыпомніць трыццаці год, пражытых ім да рэволюцыі.

... У Пецербургу шмат было дзяцей, якія пачыналі сваё працоўнае жыццё з сямі і адзінаццаці год. Музычна адароных хлопчыкаў штогод прымалі ў «школы салдацкіх дзяцей» (школы кантаністаў). Такія школы ў той час існавалі амаль пры кожным гвардзейскім палку. Іх мэтай было падрыхтаваць палкавы аркестр і царкоўны хор.

Дзевяцігадовага Алёшку, сына дворніка, маці таксама аддала ў такую «школу». Асновай школьнага «выхавання» было—мордабой і порка. Муштравалі дзяцей, як і салдатаў. Навучалі царкоўнаму спяванню, у «вольны» час вучылі чытаць, пісаць і лічыць, але не ўсіх. Таленавітых дзяцей, хто меў добры голас, залічвалі ў хор. З мэтай эксплаатацыі дзіцячага хора і асабістай нажывы школьныя вярацілы заключалі ўмовы паміж хорам і пахавальным бюро. Дзеці павінны былі за дзесяць вёрст, а то і болей, ісці адпяваць «выдатных» нябожчыкаў. Грошы, зароблены імі, прыбірала да сваёй кішані начальства школы.



Туранкову, як чалавеку з музычным талентам, пашанцавала. Яго накіравалі на харавыя курсы пры былой імператарскай капэле ў Пецербургу. Курсы гэтыя давалі вузкую адукацыю, выключна харавую. Яны існавалі для патрэб ваенных часцей і рыхтавалі практыкаў-музыкантаў, якія потым у палках кіравалі царкоўнымі хорамі.

Гэту «палачную акадэмію» (так называлі ў народзе школы кантаністаў) праходзілі хлопчыкі да восемнаццаці год. З восемнаццаці год кантаністаў пасылалі служыць на ваенную службу. Як-бы ў падзяку за салдацкі «хлеб-соль» замест чатырох год яны служылі шэсць.

Ужо тады, у юнацкія годы, А. Е. Туранкоў меў імкненне да стварэння музычных твораў. Калі аб гэтым даведаліся прыяцелі—школьнікі яны папракалі яго: «Куды ты лезеш?»... Музыку яны лічылі недасяжным Олімпам для беднага чалавека.

Рэволюцыя 1905 года абудзіла ў салдату-музыканту творчы ўздым. Пад уплывам рэволюцыйных падзей ён напісаў хор «Узнік», які ўбачыў свет толькі ў 1916 годзе. Яго надрукаваў нязначным тыражом дробны выдавец.

Рэволюцыйныя веянні і блізкасць да народа ў вершы «Кругом неправда и неволя, народ замученный молчит» Тараса Шэўчэнкі натхнілі Туранкова ўвасобіць у музыку гэты блізкі і родны яму настрой. Але за гэты твор яго ледзь не накіравалі ў дысцыплінарную роту.

Дваццацітрохгадовым хлопцам без прафесіі і адукацыі Аляксей Туранкоў пакінуў салдацкія казематы.

Спачатку хадзіў беспрацоўным. Потым вартаваў дачы і іграў танцы на вечарынках, іграў на скрыпцы ў тэатральным аркестры. Так і жыў са сваёй старэнькай маткаю. Сродкаў для паступлення ў Кансерваторыю не было— займаўся самаадукацыяй.

У 1912 годзе, зусім выпадкова, яго прынялі на летні сезон у Паўлаўскі сімфанічны аркестр. Там ён пазнаёміўся з кампазітарам А. К. Глазуновым (у той час дырыжор Пецербургскай кансерваторыі), які зацікавіўся творамі пачынаючага кампазітара. Малады музыкант спадабаўся яму сваімі здольнасцямі, і ён дапамог яму паступіць у Кансерваторыю, стварыў магчымасць займацца бясплатна.

Імперыялістычная вайна. Туранкоў у чыне ніжняга запаснога адыходзіць на фронт.

***

Прыйшла доўгачаканая Вялікая соцыялістычная рэволюцыя. Малады кампазітар сустрэў яе з вялікай радасцю. Яна адкрыла вочы палітычна-непісьменнаму і бяспраўнаму салдату, яна ўдыхнула ў яго новыя творчыя сілы. Рэволюцыя натхняла на вялікія музычныя вобразы, яна нараджала новыя думы, заклікала да новага, шчаслівага жыцця.

Тав. Туранкоў першы адгукаецца на заклік маладой краіны даць масавую рэволюцыйную песню. У 1919 годзе ён стварае цыкл рэволюцыйных песень пад назвай «Песні майстэрні».

У пятую гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі яго песні былі выданы ў Маскве музычным выдавецтвам, якое толькі пачынала сваю дзейнасць, і рэкамендаваліся гурткам рабочай і чырвонаармейскай самадзейнасці.

Лепшыя рэволюцыйныя песні А. Е. Туранкова «Кузнец», «Рабочий дворец», Ковачи» перавыдаваліся па некалькі разоў у Маскве і ў Менску і сталі вядомымі ўсяму совецкаму народу.

А. Е. Туранкоў аддае вялікую ўвагу апрацоўцы беларускіх народных песень і папулярызуе іх сярод шырокіх мас насельніцтва СССР. Песні «Лявоніха», «Перапёлачка», «Ой. ляцелі гусі», «А ў полі вярба», «Як памерла матулька» ў апрацоўцы Туранкова былі выданы ў Маскве і вядомы ўсім народам Совецкага Саюза.

У Гомелі Туранковым напісаны яго асноўныя сімфанічныя творы на тэмы беларускіх народных песень - «Скіга» і «Фантазія». Пазней напісана сімфанічная паэма «Чэлюскінцы».

Няма ні адной галіны музычнай творчасці, якую не ахапіў-бы Туранкоў. Ен піша буйныя сімфанічныя творы, масавыя песні, творы для ансамбля народных інструментаў і хоры.

Шмат прыгожых мелодый гэтага таленавітага кампазітара мы чулі ў спектаклях Беларускага і Яўрэйскага тэатраў — «Менахем-Мендл», «Гута», «Партызаны», «Мой друг», «Ярасць» і інш.

За час сваёй музычнай дзейнасці Туранковым напісана больш за дзвесце песень і дзесяткі больш буйных музычных твораў.

Кампазітар адчувае патрабаванні совецкага народа, таму так багата піша аб трактарыстках, калгасніцах, аб фабрыках і заводах, аб шчаслівым і заможным жыцці, аб слаўнай Чырвонай Арміі.

Ен у песнях апявае легендарнага палкаводца, першага маршала Совецкага Саюза Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Яго песні славяць вялікага правадыра народаў, любімага друга беларускага народа Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Яго песні агітуюць за самыя дэмакратычныя выбары, за выбары ў Вярхоўны Совет першай соцыялістычнай дзяржавы і ў Вярхоўныя Советы яе саюзных рэспублік.

Таленавіты і адданы справе соцыялізма кампазітар заслужана карыстаецца аўтарытэтам сярод беларускага народа. У 1936 годзе беларускі народ аказаў яму вялікае давер'е, абраўшы яго ў дэлегацыю, якой народ даручыў паднесці Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну.

Сваёй чэснай і скромнай работай Туранкоў заслужыў давер'е сярод кампазітараў. Яны абралі яго ў члены аргкамітэта Саюза совецкіх кампазітараў БССР.

Самае дарагое для Туранкова—наша радзіма, яе росквіт, за які змагаецца ўвесь совецкі народ, і наша слаўная большэвіцкая партыя, кіруемая геніем чалавецтва вялікім Сталіным

— Сваімі музычнымі творамі, — запэўняе тав. Туранкоў выбаршчыкаў Дзімітраўскай выбарчай акругі горада Менска, якія вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, — разам з усім совецкім народам я хачу ўславіць веліч і магутнасць нашай неасяжнай краіны, хачу апяваць шчасце і радасць нашага жыцця; я хачу ўславіць таго, хто з'яўляецца тварцом гэтага шчасця, хто ўласным прыкладам вучыць нас аддаваць веды і сілы сваёй радзіме, свайму народу, — вялікага Сталіна

А. ЕСАКОЎ.

Братерський привіт театрові Радянської України!

ТВОРЧАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА НАРОДАЎ

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя паспяхова вырашыла на аснове вучэння Маркса — Леніна—Сталіна нацыянальнае пытанне і забяспечыла ўсім нацыянальнасцям неасяжнага Совецкага Саюза велізарны росквіт соцыялістычнай культуры, соцыялістычнага мастацтва.

Украінскі совецкі тэатр за 20 год Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі дабіўся значных перамог на аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

13 год работы Одэскага тэатра Рэволюцыі — гэта вялікая падзея ў творчым развіцці тэатральнага мастацтва Совецкай Украіны, нацыянальнага па сваёй форме і соцыялістычнага па зместу.

13 год мастацка-палітычнай работы тэатра—канкрэтнае сцвярджэнне правільнасці нацыянальнай палітыкі, нацыянальнага культурнага будаўніцтва Совецкай Украіны, якое ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна.

Нарэшце, 13 год работы тэатра — гэта шлях упартай барацьбы тэатра за актора—грамадзяніна Сталінскай эпохі, сапраўднага эмагара-трыбуна, за свядомага творца соцыялістычнага мастацтва, які ўсвядоміў сваю ганаровую адказную ролю ў працэсе класавай барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва; гэта барацьба за творчы метад, за соцыялістычны рэалізм.

Творчы шлях тэатра быў вельмі складаны, асабліва за апошнія годы. Буржуазныя нацыяналісты ўсіх відаў і колераў спрабавалі сказіць палітычны і творчы твар нашага тэатра.

Зімовы тэатральны сезон 1937-38 года быў этапным для тэатра Рэволюцыі, які канчаткова перабудаваў сваю ідэйна-творчую работу.

Ворагі народа, выкрытыя і знішчаныя слаўнымі органамі НКВД, спрабавалі сарваць работу тэатра Рэволюцыі, ігнаруючы п'есы совецкіх драматургаў, фальсіфіцыруючы п'есы дарэволюцыйных украінскіх драматургаў, скажаючы соцыяльную праўду жыцця дарэволюцыйнай Украіны. Ворагам не ўдалося і ніколі не ўдасца адарваць наш тэатр ад твораў нашых совецкіх драматургаў.

Пад кіраўніцтвам партыйных і грамадскіх арганізацый горала згуртаваны калектыў Одэскага тэатра Рэволюцыі змяніў існаваўшае становішча і забяспечыў свой рэпертуар у першую чаргу творамі совецкіх драматургаў.

На працягу апошняга сезона тэатр паставіў цэлы рад п'ес совецкіх аўтароў: «Праўду» і «Гібель эскадры» А. Карнейчука, «Вассу Жэлезнову» А. М. Горкага, «Гонар» грузінскага драматурга Г. Д. Мдзівані, «Простую дзяўчыну» В. Шкваркіна і п'есу В. Катаева «Я — сын працоўнага народа».

Наша паездка ў БССР, як і прыезд Беларускага тэатра ў Одэсу, з'яўляецца адной з найярчэйшых праяў творчага супрацоўніцтва народаў Совецкага Саюза, магчымага толькі ва ўмовах перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

З вялікай радасцю і гонарам рыхтаваўся тэатр да сваёй другой паездкі ў Совецкую Беларусь. У гэтым жывым азнаямленні з Совецкай Беларуссю, у гэтых творчых справаздачах—зарука сапраўднай інтэрнацыянальнай сувязі працоўных і абмен культурнымі каштоўнасцямі братніх рэспублік. Такая сапраўдная і непарыўная дружба магчыма толькі ва ўмовах нашай шчаслівай радзімы, у Совецкім Саюзе.

З вялікім творчым хваляваннем чакаем мы радаснай сустрэчы з працоўнымі братняй БССР, чакаем ад грамадскасці БССР праўдзівай большэвіцкай крытыкі нашых работ.

Т. А. БОРЫН.
Галоўны рэжысёр тэатра.



Одэскі тэатр Рэволюцыі. Сцэна з 1-га акта спектакля «Простая дзяўчына» В. Шкваркіна (пастаноўка рэжысёра Т. Борына).

ШТО МЫ ПАКАЖАМ ГЛЕДАЧАМ МЕНСКА

Бліскучай перамогай соцыялізма, перамогай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ў нашай краіне забяспечан поўны росквіт культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. Совецкае мастацтва ёсць мастацтва ўсяго перадавога прагрэсіўнага чалавецтва. На бліскучых узорах мастацтва вялікага рускага народа, побач з лепшымі ўзорамі сусветнай культуры, вучацца і будуць вучыцца ўсе народы Совецкага Саюза.

Гастролі Одэскага Дзяржаўнага тэатра Рэволюцыі ў гарадах і сталіцы братняй Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі — вялікая падзея для ўсяго творчага калектыва тэатра.

Одэскі тэатр Рэволюцыі з выключнай сур'ёзнасцю і ўвагай рыхтаваўся да сваёй другой паездкі па Совецкай Беларусі.

Тэатр у гэтым жывым глыбокім азнаямленні з культурай братняй рэспублікі бачыць заруку сапраўднай інтэрнацыянальнай сувязі працоўных, бачыць аснову для сталага абмену культурнымі каштоўнасцямі нашых братніх народаў. Вось чаму совецкая грамадскасць Одэсы з жывой цікавасцю сустрэла гастролі ўжо знаёмага ёй Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.

Гастролі Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра ў УССР і гастролі Одэскага тэатра Рэволюцыі ў БССР праходзяць адначасова. Гэта ўжо другі абмен тэатраў двух братніх совецкіх рэспублік творчым вопытам, — вопытам, які ўмацоўвае братнюю сувязь народаў вялікай Совецкай краіны. Такая сапраўды непарыўная дружба магчыма толькі ва ўмовах нашай шчаслівай совецкай радзімы, сагрэтай цудоўным сонцам вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

Одэскі Дзяржаўны украінскі тэатр Рэволюцыі існуе 13 год. Творчы шлях тэатра быў вельмі складаны. Гэты шлях быў асабліва цяжкім у апошнія годы, калі буржуазныя нацыяналісты спрабавалі скрывіць палітычны і творчы твар тэатра. Подлыя ворагі народа, выкрытыя слаўнымі органамі НКВД, спрабавалі сарваць работу тэатра Рэволюцыі.

Ажыццяўляючы рашэнні лютаўска-сакавіцкага пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні таварыша Сталіна, калектыў нашага тэатра пад кіраўніцтвам партыйных і грамадскіх арганізацый мабілізуе ўсе сілы для ліквідацыі вынікаў шкодніцкай работы.

На працягу апошняга тэатральнага сезона тэатр паказаў «Праўду» Карнейчука, «Гонар» Мдзівані, «Я — сын працоўнага народа» В. Катаева, «Простую дзяўчыну» Шкваркіна. Акрамя гэтага, адноўлена «Васса Жэлезнова» — твор вялікага асновапаложніка совецкай літаратуры А. М. Горкага, а таксама дзве п'есы украінскага совецкага драматурга, члена Вярхоўнага Совета СССР А. Е. Карнейчука — «Гібель эскадры» і «Банкір».

На гэтых лепшых творах совецкай драматургіі і на ўзорах сусветнай класічнай і украінскай дарэволюцыйнай літаратуры вырас і ўмацаваўся творчы калектыў тэатра, расце яго маладая змена.

У гастрольную паездку па БССР тэатр Рэволюцыі вязе з сабою сем пастановак. Сярод іх—лепшая пастаноўка тэатра «Праўда» А. Карнейчука, у якой паказан вобраз геніяльнага правадыра Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі В. І. Леніна. Велізарную работу над стварэннем вобраза В. І. Леніна прарабіў артыст А. І. Крамарэнка.

Акрамя «Праўды», тэатр вязе з сабою пастаноўку п'есы грузінскага совецкага драматурга Г. Д. Мдзівані «Гонар» — пра пільнасць і совецкі патрыятызм. З совецкіх п'ес будзе паказана камедыя В. Шкваркіна «Простая дзяўчына».

Тэатр пакажа таксама дзве п'есы украінскіх класікаў: «Лымірыўну» Панаса Мірнага і «Безталанну» Табілевіча, а таксама «Сарачынскі кірмаш» па Гогалю. У рэпертуары тэатра таксама адна пастаноўка з сусветнай класікі—«Отэлло» В. Шэкспіра.

У гастрольную паездку выязджае ўвесь творчы калектыў тэатра.

Наш прыезд у Совецкую Беларусь супаў з усенароднай урачыстасцю—выбарамі у Вярхоўныя Советы саюзных і аўтаномных рэспублік СССР. Украінскі народ і беларускі рыхтуюцца да гістарычнага дня 26 чэрвеня, да выбараў у Вярхоўныя Советы. Калектыў тэатра з гонарам будзе агітаваць і галасаваць за блок комуністаў і беспартыйных, за лепшых з лепшых людзей Совецкай Беларусі, кандыдатаў у Вярхоўны Совет БССР.

Б. М. ФРЫД.
Дырэктар тэатра.

Вялікае творчае хваляванне

Яшчэ да работы ў тэатры Рэволюцыі мне даводзілася ездзіць у Беларусь у складзе Харкаўскага Чырвоназаводскага тэатра і бачыць амаль усю рэспубліку. Я вынес велізарнае ўражанне ад гэтай паездкі, наглядна пазнаёміўшыся з гаспадарчым і культурным росквітам братняй рэспублікі, з уздымам культуры беларускага народа.

Я ўжо выступаў перад беларускім гледачом, але новай сустрэчы чакаю з вялікім творчым хваляваннем. Мне прыдзецца іграць вялікую і адказнейшую за ўсю маю акторскую дзейнасць ролю—Владзіміра Ільіча Леніна ў нашым спектаклі «Праўда». Мне вельмі карысна будзе пачуць думку беларускага гледача в повару маёй работы. Я адчуваю тым большую адказнасць за прадстаячыя выступленні, што ў Беларусі нам прыдзецца іграць пасля гастролей такога моцнага калектыва, як Маскоўскі тэатр Рэволюцыі, які ў сваім рэпертуары таксама мае п'есу «Праўда».

Узаемнае азнаямленне і сяброўская сувязь нашых культур — гэта сапраўднае інтэрнацыянальнае адзінства народаў, гэта выключная з'ява нашай Сталінскай эпохі, нашага шчаслівага і раднага жыцця.

Сардэчнейшае прывітанне працоўным БССР.

А. І. КРАМАРЭНКА.
Артыст Одэскага тэатра Рэволюцыі.

Чакаем радаснай сустрэчы

Я, як і ўсе работнікі нашага тэатра, з вялікай радасцю еду ў братнюю Беларусь. У часе нашай мінулай паездкі мы не толькі давалі спектаклі, але і выязджалі на прадпрыемствы, у чырвонаармейскія часці, сустракаліся з навуковымі работнікамі—набылі шмат знаёмстваў са знатнымі людзьмі рэспублікі. Тым больш радасным будзе для нас сустрэцца зноў з беларускімі таварышамі, паказаць ім свае новыя работы.

Мы павінны будзем за гэты раз яшчэ лепш правесці нашу масавую работу, больш выязджаць па прадпрыемствы, часцей сустракацца са стаханаўцамі заводаў і калгасных палёў, каб лепш азнаёміць іх з тымі дасягненнямі, да якіх прышоў пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна наш украінскі народ у братнім саюзе з усімі народамі нашай краіны. Наша паездка ўзбагаціць увесь калектыў новымі творчымі ўражаннямі, увалле ў яго свежыя сілы для далейшай работы.

А. Е. МЕШЧЭРСКАЯ.
Заслужаная артыстка УССР

ОДЭСКАМУ ТЭАТРУ РЭВОЛЮЦЫІ

Совецкая Украіна, як і Совецкая Беларусь, разграміўшы асіныя гнёзды трацкісцка-бухарынскай і буржуазна-нацыяналістычнай нечысці, з вялікай радасцю рыхтуецца да знамянальнай даты — 26 чэрвеня — выбараў у Вярхоўныя Советы сваіх рэспублік. У гэты дзень з пачуццём найвялікшай гордасці абяруць працоўныя Беларусі і Украіны ў свае соцыялістычныя парламенты геніяльнага прадаўжальніка справы вялікага Леніна — правадыра прыгнечаных усяго свету, нашага бацьку і настаўніка таварыша Сталіна, яго бліжэйшых саратнікаў і лепшых сыноў радзімы, кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Шмат агульнага ў гісторыі украінскага і беларускага народаў. У адным радзе, пры падтрымцы вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам слаўнай большэвіцкай партыі змагаліся яны на франтах грамадзянскай вайны, разам будавалі і пабудавалі шчаслівае, раднае жыццё; непрыступнай крэпасцю стаяць яны на варце совецкіх граніц, з'яўляючыся фарпостамі соцыялізма на Захадзе.

Велізарная дапамога і ўвага, якія штодзённа аказваюць мастацтву партыя і ўрад, прывялі наш совецкі тэатр да небывалага росквіту: совецкі тэатр стаў лепшым у свеце.

Мы ганарымся дасягненнямі совецкага мастацтва, народнага мастацтва, мастацтва, вартага эпохі вялікага Сталіна.

У пісьме да тав. Іванова таварыш Сталін указаў, што совецкі народ павінен заўсёды знаходзіцца ў стане мабілізацыйнай гатоўнасці. Гэта ўказанне ў поўнай меры адносіцца і да тэатра. Баявая задача ўсёй арміі работнікаў сцэны ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць вынікі шкодніцтва на фронце мастацтваў, стварыць спектаклі, праўдзіва, глыбока і высока-мастацка адлюстроўваючыя гераічныя старонкі гісторыі народаў Совецкага Саюза.

Кожны тэатр павінен стаць ідэйнай крэпасцю, кожны спектакль павінен яшчэ больш узнімаць баявы дух магутнай арміі байцоў за соцыялізм, павінен вучыць распазнаваць і знішчаць ворага.

Ад імя работнікаў мастацтваў мы вітаем калектыў работнікаў Украінскага тэатра Рэволюцыі.

Мы ўпэўнены ў тым, што сваёй канкрэтнай работай у сталіцы БССР тэатр прадэманструе вялікі рост совецкага мастацтва братняй рэспублікі, пакажа дасягненні і велізарныя творчыя магчымасці свайго калектыва ў справе стварэння спектакляў, вартых нашага вялікага совецкага народа.

Няхай жыве совецкае мастацтва, нацыянальнае па форме і соцыялістычнае па зместу!

Няхай жыве вялікая дружба народаў СССР!

Няхай жыве наш правадыр і настаўнік — вялікі Сталін!

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР.

НАШ ВЯЛІКІ ГОНАР

У шчаслівы час прыехалі мы ў братнюю Совецкую Беларусь. Мы горды тым, што разам з беларускім народам аддадзім свае галасы за творца шчаслівага жыцця працоўных — роднага, любімага Сталіна.

Не падарваць нікому магутнасці нашай вялікай радзімы, не адняць наша шчасце праклятаму фашызму і яго подлым агентам — трацкісцкім шпіёнам і дыверсантам. Пад абаронай нашай неперамажнай Чырвонай Арміі і слаўнага НКВД мы будзем тварыць новыя культурныя каштоўнасці для шчасця ўсіх працоўных.

З вялікай радасцю мы ўключыліся ў падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет Беларусі, каб дапамагчы працоўным рэспублікі абраць у свой соцыялістычны парламент лепшых людзей, якія будуць цвёрда прадаўжаць справу Леніна—Сталіна.

Л. В. МАЦЫЕЎСКАЯ.
Заслужаны дзеяч мастацтваў.



Одэскі тэатр Рэволюцыі. Сцэна з спектакля «Гонар» Г. Мдзівані (пастаноўка рэжысёра Т. Борына).

Цімафей Васільевіч Калінічэў

(Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Панізоўскай выбарчай акругі Оршанскага раёна)

Чатырнаццаць год было Цімафею Васільевічу Калінічэву ў 1914 годзе, а ён меў ужо чатырохгадовы працоўны стаж. Сын бедняка, Цімафей Васільевіч быў адным з дванаццаці ў сваіх бацькоў. Дзесяць гадоў яму — а ён працуе ўжо ў людзей: улетку пастухом у заможнага кулака, а ўзімку ў шаўца-лапатніка. Але ніколі не еў ён досыта, ніколі не меў ні абутку, ні сарочкі на целе, ні чалавечай вопраткі.

Працуе ён батраком у велізарным маёнтку пана Шышкіна, недалёка ад станцыі Мілерава. Удзень працуе на сенажаці, а ўночы павінен коней сперагчы. Выязджае Цімафей на сенажаць, а яму наўздагон сон імчыцца.

Пан Шышкін і яго аканом вельмі клапаціліся аб сваіх конях: каб мелі добры догляд, добры адпачынак, каб добра елі. Але не клапаціўся пан Шышкін аб адпачынку сваіх работнікаў — ці гэта былі дзеці, ці сталыя, моладзь, ці старыя.

Цімафей дрэмле на сядзенні касілкі. Рослыя коні ідуць паскораным крокам. І раптам Цімафей упаў з машыны. Нож наскочыў на корч і зламаўся, а машына перакулілася. Коні пайшлі далей, цягнучы за сабой касілку дагары катамі. З усіх бакоў кінуліся да Цімафеевай касілкі батракі і батрачкі, а паміж імі — высокі, рыжабароды аканом са сваімі кацінымі вачыма.

Цімафей стаіць спалоханы. Прачнуўся ён ад падзення і ад лямапту людскога. Аканом сваімі тоўстымі пальцамі схапіў Цімафея за грудзі, пачаў кідаць і трэсці яго за кашулю, ірвануў— і з-пад паяска пасыпаліся кускі хлеба і скарынкі.

— Ага, дык ты яшчэ і хлеб крадзеш?! — затупаў аканом і аж заскрыгатаў зубамі. Моцным кулаком ляснуў Цімафея па твары.

Стары батрак Ягор, які ведаў шмат казак пра скарбы, захаваныя ў стэпах, якія так любіў слухаць Цімафей, падышоў да аканома, стаў на калені і пачаў маліць яго і хрысціцца:

— Хай барын змілуецца над бедным хлопцам; куды яму цяпер ісці? Бацька-ж прагоніць яго з хаты...

А калі-б бацька і не прагнаў з хаты, дык якое шчасце чакала яго дома? Дома таксама не адпачнеш: голад, холад, жабрацтва.

На гэты раз плач Ягора «змякчыў» сэрца аканома. Цімафей атрымаў «усяго» пару разоў кулаком па твары і бізуном па плячах.

Прайшло каля чатырох год з часу гэтага выпадку, а Цімафей усё яшчэ цягнуў ярмо батрака ў пана Шышкіна.

Прышло лета 1918 года. Немцы, белагвардзейцы і рознага роду інтэрвенты, накінуліся на нашу, тады яшчэ маладую, радзіму і ірвалі яе з усіх бакоў.

18-гадовы Цімафей, тады непісьменны, чуў аб чырвоных, аб большэвіках, аб тым, што яны вызваляюць рабочых і сялян ад розных здзекаў багатых і паноў. Ён чуў, што большэвікі, чырвоныя змагаюцца за тое, каб селянін і рабочы жыў шчаслівым жыццём, каб не пакутваць яму ў голадзе і нястачы, а тут над ім панаваў яшчэ Шышкін і рыжабароды аканом.

— Павязеш сёння воз збожжа на станцыю, — загадаў аканом Цімафею.



Трэба было везці збожжа на белагвардзейскую базу.

Дзень выдаўся гарачы, пякельны. Цімафей сядзіць на запрэжаным у пару каштанавых коней возе. Вязе поўны воз збожжа. Недалёка ад станцыі, з-пад гары едуць яму насустрач чалавек 12 узброеных коннікаў.

— Стой! Куды едзеш, зямляк? — запытаўся у яго адзін з коннікаў, высокі, худы, з чырвонай істужкай на грудзях.

— На станцыю. Вязу збожжа ў камендатуру.

— Наша камендатура тут, зусім блізка. Чаго табе ехаць туды. Вязі збожжа, куды мы табе пакажам. Хочаш быць чырвоным, хлапец? Хадзі з намі, дапамагай нам праганяць паноў і буржуяў. Будзеш у нас кавалерыстам на адным з гэтых коней.

— І коні будуць мае? — спытаўся Цімафей.

— Зразумела, твае! — адказаў высокі і ўсміхнуўся.

Праз поўгадзіны Цімафей ужо быў з кавалерыстамі ў штабе. Праз плячо ў яго на рамні — сабля. Ён стаў кавалерыстам і высокі вучыў яго страляць з вінтоўкі і валодаць клінком.

Праз некалькі дзён Цімафей у ліку дзесятка кавалерыстаў ехаў па стэпу ў разведку.

Было подвечар. Сонца ўжо спускалася на захад. Цені паўзлі ад высокіх тапалёў, што раслі каля хутара пры дарозе. Прахладны вецер лашчыў запыленыя твары коннікаў. Коні ішлі ціхім крокам. З-за хутара выехала ім насустрач вялікая колькасць салдатаў з афіцэрам на чале.

Высокі з чырвонай істужкай скамандаваў:

— У атаку!

Цімафей спачатку крыху разгубіўся: першы раз у баю. Дзень-два ўсяго, як ён скінуў з сябе батрацкае ярмо. Высокі скамандаваў:

— Страляй! — і ірвануў Цімафея за руку. — Страляй, чаго глядзіш?!

Цімафей прыліп нагамі да каня, схапіў вінтоўку і стрэліў. З першага-ж разу яму пашанцавала: ён трапіў у афіцэра і напавал паклаў яго.

Так адбылося першае Цімафеева баявое хрышчэнне. І з таго часу Цімафей ужо меў амуніцыю, пару ботаў са шпорамі, а яго конь — сядло.

Глыбокай ноччу вярнуліся кавалерысты ў штаб. Было ціха, зоркі міргалі з сіняга неба. Цімафей стаяў каля свайго каня, гладзіў яго, песціў: гэта ўжо не пана Шышкіна конь, гэта ўжо яго, Цімафея, баявы конь.

...Увесь час грамадзянскай вайны Цімафей Васільевіч Калінічэў быў на перадавых пазіцыях. Ён змагаўся на Паўднёвым фронце пад Царыцынам супроць дзенікінскіх банд, супроць банд Шкуро і Мамантава пад Варонежам, супроць Врангеля ў Крыму, супроць белапалякаў на Заходнім фронце, прымаў актыўны ўдзел у ліквідацыі банд на Паўночным Каўказе. Вялікі і шырокі шлях барацьбы прарабіў Цімафей Васільевіч Калінічэў.

Але Цімафей Васільевіч — непісьменны. Хочацца яму хоць чытаць навучыцца, прачытаць каб хоць вершы і лозунгі на плакатах. Лекпом абяцаў коннікам, Цімафею і іншым, адкрыць ім сакрэт чытання.

Здаволены сёння Цімафей Васільевіч і яго таварышы-непісьменныя: яны вярнуліся з перамогай. Але яшчэ штосьці павялічыла іх радасць. Лекпом падвёў іх да плакатаў, даў па аркушу паперы і па вуглю і прапанаваў ім змаляваць некаторыя літары з плаката на паперы. Ён вучыў іх чытаць гэтыя літары. І Цімафей, малады чырвоны кавалерыст, умее ўжо чытаць некаторыя літары. Ён прачытаў нават цэлы склад.

І так кожную вольную хвіліну. Нават час паходу і то скарыстоўваюць кавалерысты, каб вучыцца грамаце.

Заходні фронт. Едуць чырвоныя кавалерысты, ахутаныя хмарамі пылу. Пыл перашкаджае глядзець. Яшчэ перад выступленнем у паход яны знайшлі спосаб, як прадаўжаць працу па авалоданню сакрэтам чытання: на спіну кавалерыста пярэдняга рада замацоўвалі паперу з напісанымі літарамі і складамі і такім чынам практыкаваліся ў чытанні, едучы на конях.

Цімафей Васільевіч едзе на кані, глядзіць напружана скрозь пыл на спіну пярэдняга конніка і чытае ўголас: «Ня-хай жы-ве чыр-во-ная ка-ва-ле-рыя».

Якая радасць: ён прачытаў ужо цэлы лозунг, такі родны лозунг! Ён здаволены, ён гладзіць пяшчотна па цёмнакаштанавай грыве свайго каня. Гэта-ж яго стары друг, не адну ноч пераначаваў ён са сваім канём на стайні Шышкіна, а цяпер конь дапамагае яму замацоўваць заваёвы рэволюцыі. Не адзін геройскі бой правялі яны разам.

На палях бітвы Цімафей Васільевіч не толькі па-геройску змагаўся супроць ворагаў, але і грамаце навучыўся і разбірацца ў тапаграфічнай карце. І ў апошнія часы грамадзянскай вайны ён ужо — узводны камандзір.

А пасля грамадзянскай вайны Цімафей Васільевіч аддаўся вучобе. Тры годы ён вучыўся ў кавалерыйскай школе, скончыў яе ў 1925 годзе і атрымаў званне камандзіра Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. У тым-жа 1925 годзе Калінічэў уступае ў рады комуністычнай партыі. Да 1930 года ён узводны камандзір ў кавалерыйскай дывізіі. З 1930 года ён узводны камандзір палкавой школы і адначасова сакратар партыйнай ячэйкі. У 1933 годзе Калінічэў быў адкамандыраван вывучаць новую ваенную спецыяльнасць.

Да 20-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота тав. Калінічэў быў указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за геройскую барацьбу ў баях супроць ворагаў совецкай улады і за выдатныя поспехі і дасягненні ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы ўзнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга і юбілейнай медаллю «XX год РСЧА». За гэты час былы непісьменны Цімафей Васільевіч вырас у маёра.

— Вылучэнне мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, — кажа Цімафей Васільевіч Калінічэў, — для мяне новая велізарная ўзнагарода, і ўсёй сваёй працай я пастараюся апраўдаць гэтую ўзнагароду, апраўдаць тое вялікае давер'е, якое мне аказаў народ. Нічога на свеце няма даражэй для адданага сына радзімы, як служыць свайму народу.

У. ФІНКЕЛЬ.

З. Бядуля

РАМАН Эд. САМУЙЛЁНКА „БУДУЧЫНЯ“

(Думкі і ўражанні)

Калі праводзеш мысленна простую лінію па карце нашай совецкай радзімы — шостай часткі зямлі—адным канцом трапіш у субтропікі, другім — у далёкую поўнач. На неасяжных прасторах, аб'яднаных героікай грамадзянскай вайны і сонечным шчасцем Сталінскай Канстытуцыі, жыве сотня нацый. Усе народы СССР складаюць адзін магутны арганізм — з адной мэтаімкнёнасцю, з адным вялікім пачуццём любві да соцыялістычнай радзімы, да комуністычнай партыі, да любімага Сталіна. У якой-бы краіне нашай большэвіцкай зямлі ты ні бываў, ты ўсюды — свой, родны, блізкі, ты ўсюды дома.

У гэтым — невыразімае шчасце, сіла, веліч і небывалае хараство пачуцця 170-мільённага, рознамоўнага і разнапляменнага, вялікага совецкага народа, асветленага сталінскімі правамі чалавека і грамадзяніна. Наша любоў да радзімы не мае сабе прыкладаў на ўсім свеце. І ў якой-бы краіне па-за межамі СССР працоўны народ ні змагаўся супроць крывавжэрнай буржуазіі, ён, працоўны народ, натхняецца нашымі перамогамі, вучыцца ў нас метадам змагання за свае чалавечыя правы. І мы, совецкія людзі, з такімі працоўнымі народамі па-за межамі нашай зямлі — блізкія і родныя.

Наша замілаванне да радзімы агортвае і абагравае жыватворчымі праменнямі прыгнечаную частку чалавецтва на ўсім свеце.

Калі Эдуард Самуйлёнак напісаў раман на тэму грамадзянскай вайны ў братняй Грузіі, дык гэта радуе мяне нават куды больш, чым калі-б ён напісаў кнігу на сугуба беларускую тэму. Даўно пара нам, беларускім пісьменнікам, шырэй выходзіць з рамак «сваёй» тэрытарыяльнай тэматыкі. Жыццё абы якога совецкага народа з'яўляецца і беларускай тэматыкай. Гэта нельга ахарактарызаваць адным толькі словам салідарнасці з братнімі рэспублікамі. Жыццё, перамога, інтарэсы і патрэбы кожнага народа СССР — кроўная справа, уласнае жыццё кожнага совецкага грамадзяніна.

Раманам тав. Самуйлёнка «Будучыня» зацікавіліся ўсе нашы пісьменнікі. Няма цярплівасці чакаць, пакуль твор выйдзе з друку, — мы яго чытаем у распаўсюджаных сярод пісьменніцкай грамадскасці друкаваных на машынцы экземплярах.

Каля пяцісот густа надрукаваных старонак. Прызнацца, я з апаскай узяўся за тоўсты рукапіс. І першае знаёмства з ім паказала, што гэта чыстапробны метал і ён звініць поўнагучна — без трэшчын.

Першыя дзвесце старонак я прачытаў, што называецца, адным дыхам — захапляючая фабула, яркія старонкі з гісторыі грамадзянскай вайны братняй гераічнай Грузіі. Жывыя людзі. Яны абрысаваны трапна і лаканічна. Трапныя, жыццёвыя іхныя ўчынкі на ясным фоне гістарычных падзей. Пісьменнік адразу і цалкам бярэ чытача ў свае рукі. Адразу пачынаеш любіць сіраціну—хлопчыка Іліко, яго суседзяў—сялян-беднякоў, чырвоных партызанаў, рускага інжынера Андрэя Міхайлавіча, якога ўжо дваццаць год захапляе ідэя асушэння жудаснай малярыйнай Калхіды. Ён пераконваецца, што толькі рабочы народ пры соцыялізме можа гэта рэалізаваць. Адразу пачынаеш ненавідзець Сімона — кулака-купчыка, які ўчыняе нечалавечы здзек з беднага сялянства, з сваіх парабкоў на вёсцы і ў горадзе. Падзеі грамадзянскай вайны разгортваюцца з кожнай старонкай шырэй і глыбей.

Тав. Самуйлёнак, нягледзячы на вялікую колькасць матэрыялу, не стамляе чытача. З захапленнем чытаеш раман да канца. У пісьменніка манера добрага белетрыста. Ён піша плаўна, роўна, рухава. Ён ставіць кропку там, дзе нецярпліва хочацца ведаць: «а што было далей?»

У некаторых раманах гэта робіцца танна, нязграбна, а наш пісьменнік зацікаўлівае чытача драматызмам падзей. Ён гэта робіць з добрым адчуваннем такту.

Апавядальная плынь імчыцца доўгай рэчкай. Спачатку яна роўная і спакойная, але чым далей назіраеш за ёю — рэчка пачынае ледзь непакоіцца, зыбацца, на ёй паказваюцца дробныя хвалі, якія з кожным разам усё больш растуць і становяцца бурлівымі і пеністымі, аж пакуль не ўліваюцца гучнымі ўсплёскамі ў мора.

Вораг задушан. Грузінскі пралетарыят і працоўнае сялянства ўліваюцца ў вялізнае неабдымнае мора рэволюцыі ўсіх прыгнечаных пры царызме народаў. Гераічныя працоўныя пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў святкавалі перамогу над драпежнай буржуазіяй на Каўказе.

Трапна, лаканічна і цёпла тав. Самуйлёнак паказвае сілуэты слаўных саратнікаў Сталіна, любімых усімі совецкімі народамі Кірава і Орджанікідзе. Магутная Чырвоная Армія, з'арганізаваная з усіх народаў, насяляючых нашы неасяжныя абшары ад далёкай Сібіры да казачнай Калхіды, вызваліла і прыгнечаны Каўказ.

Гэтым канчаецца першая кніга рамана тав. Самуйлёнка.

Тав. Самуйлёнак больш за іншых нашых пісьменнікаў спыняецца ў сваіх творах на дынамічных падзеях, унікаючы лішняга псіхалагізма. Гэта яму



Эд. САМУЙЛЕНАК.

нядрэнна ўдаецца. Таму яго твор чытаецца лёгка, без напружання. Знешняя арнаментыка не захапляе аўтара. Унутраны сюжэтна-фабульны разварот —яго стыхія. Шырока разгорнутае палатно рамана не вызначаецца адточанасцю стылю, яркімі фарбамі рысунка, затое тканіна зроблена з моцных нітак. Яна добротная і доўга будзе трымацца. Раман тав. Самуйлёнка — безумоўнае дасягненне ў нашай беларускай совецкай літаратуры.

Я выказваю толькі свае першыя ўражанні, не спыняюся на рознастайным тыпажы, на каларытных дадатных і адмоўных фігурах рамана. Яны даходчывыя, яны выклікаюць у чытача адпаведныя пачуцці. Аўтар дасягнуў сваёй мэты.

Тав. Самуйлёнак не раскідваўся ў сваім творы на вялікае разгортванне часу і прасторы. Падзеі адбываюцца на працягу некалькіх месяцаў у двух-трох вёсках і двух-трох гарадах—Поці, Баку, Тбілісі. Галоўная ўвага накіравана на невялікі лік людзей, якія пераплецены канфліктамі і праходзяць праз увесь раман ад пачатку да канца. Аднак, хацелася-б бачыць больш шырока паказаной працу падпольнага партыйнага камітэта, больш поўную карціну здзекаў з грузінскага пролетарыята азвярэлых найміттаў сусветнай буржуазіі. Не паказан тагочасны завод.

Паўтараю, што гэта маё першае ўражанне. Магчыма, што пры другой чытцы, пасля выхаду кнігі з друку гэты папрок адпадзе.

Маю да аўтара «Будучыні» другі папрок. Пры чытцы рамана я ў адным-двух месцах міжволі спыняўся,—спыняўся з крыўдай. Аўтар паставіў як-бы велічэзныя кропкі — даўжэзныя маналогі ў некалькіх месцах (гутарка старога Топурыя з хлопчыкам Вано, гутарка Міхаіла і Тарыеля аб народзе і г. д.). Якраз у гэтых месцах тав. Самуйлёнак паказаў сябе куды слабейшым. Маналогі даволі публіцыстычныя і выпадаюць з агульнага, строга вытрыманага тону рамана.

Вока сапраўднага мастака пільнае і трапнае нават тады, калі яно ўтароплена ў новы, нязвыклы для яго аб'ект. Тав. Самуйлёнак пражыў у Грузіі кароткі час, ён бачыў толькі сучасную квітнеючую Грузію і выключна паводле матэрыялаў мог вывучыць гісторыю грамадзянскай вайны. Толькі ў сваім уяўленні ён мог бачыць прыгнятальнікаў грузінскага народа, аднак персанаж яго рамана — жывы і рознастайны. Людзі на ўсім свеце падобны ўчынкамі і характарам адны да другіх.

Добра ўспрымаецца пейзаж. Мне здаецца, што Калхіда намалявана ў рамане Самуйлёнка даволі жывапісна. Не вонкавым выглядам, а жудасцю сваёй яна нагадвае беларускае Палессе.

«Будучыня» Эд. Самуйлёнка — яшчэ не закончаны твор. Гэта толькі першая кніга рамана, у якой паказана змаганне за будучыню.

У другой кнізе павінны трактавацца росквіт Грузіі, яе новыя людзі, яе аднооўленая зямля, ператвораная ў шчаслівую зямлю Калхіда.

Хочам пабачыць у другой кнізе нешчаслівага калісьці хлопчыка Іліко і іншых герояў шчаслівымі на сонечнай зямлі краіны Сталінскай Канстытуцыі.

Ад сэрца пажадаем тав. Самуйлёнку прыступіць да плённай працы над другой кнігай рамана.

Пісьмо ў рэдакцыю

Паважаны тав. рэдактар!

Працуючы ў газеце «ЛіМ» у якасці загадчыка аддзела мастацтваў, я падпісаў у друк у 1937 годзе артыкул «Ачысціць Кіраўніцтва па справах мастацтваў ад нягодных работнікаў». У гэтым артыкуле быў высунут рад палітычных абвінавачанняў супроць тт. Рубінштэйна, Любамірскага і Прагіна.

Праверкай было ўстаноўлена, што гэтыя палітычныя абвінавачанні не пацвярджаюцца фактамі, што рэдакцыя і я ў прыватнасці былі ўведзены ў заблуджэнне тэндэнцыйным, паклёпніцкага характару матэрыялам, пададзеным у рэдакцыю. Я зрабіў вялікую памылку, што не праверыў фактаў і даверыўся гэтаму матэрыялу. Гэтым пісьмом хачу выправіць сваю памылку і прашу ў памянёных таварышоў прабачэння.

М. ЮДЭЛЕВІЧ.

Кузьма Чорны

ПРА АПОВЕСЦЬ Ул. КАНДРАЦЕНІ „КАХАННЕ“ *)

У аповесці Ул. Кандрацені «Каханне» ярчэй за іншыя вобразы вырысоўваецца персанаж Арцём. Гэты чалавек пераступіў мяжу паміж новым і старым светам і вырывае з сваёй душы карэнні старога. Вядома, гэта робіцца не таму, што раптам так чалавеку заманулася. Гэта работа не лёгкая, Арцём «абнаўляе» сваю душу з болем. Гэта робіцца таму, што навакол яго соцыялістычная сучаснасць, у якой дарэшты выбіт грунт з-пад старога. Арцёма абкружаюць людзі соцыялізма: яго дачка Марына, яе жаніх Алесь і таварыш самога Арцёма — Саўка. Новае жыццё бурнай ракой струменіцца ў сваім разліве і змывае з чалавека ўвесь бруд. Малады пісьменнік стварае тут цэлую карціну жыццёвых з'яў, якія, будучы зведзены ў адзін сюжэтны вузел, вырашаюць ідэйны замысел усяго твора.

Алесь, зусім яшчэ малады хлопец, любіць Арцёмаву дачку Марыну. Але Арцём недалюблівае Алеся. Не таму, што бачыць у ім што-небудзь дрэннае, а таму, што Марына, такая ўдалая і прыгожая дзяўчына, павінна, як яму здаецца, пайсці за нейкага незвычайнага жаніха. Арцёму здаецца, што гэты жаніх можа з'явіцца толькі тады, калі ў Марыны будзе вялікі пасаг.

Алесь згубіў партфэль з дзяржаўнымі грашыма, якія ён вёз у раённы банк. І гэтыя грошы якраз знайшоў Арцём. Можна сабе ўявіць раднаснае ўтрапенне гэтага чалавека!

«Забыўшыся аб усім на свеце, ён сядзеў на карачках, як дзіця, чмыхаў валасатымі наздрамі, а тоўстыя патрэсканыя пальцы сударгава ірвалі замок» (у партфэлі).

Арцёма апанавала радасць, што вось ужо ёсць і вялікі пасаг для Марыны. Алесь неўзабаве вярнуўся, шукаючы грошай, але Арцём аб сваёй знаходцы яму не прызнаўся.

Выступае наверх чарната чалавечай душы. Арцём ведае, што з прычыны такога няшчасця з Алесем, мучыцца яго дачка Марына, аб шчасці якой ён нібыта так дбаў. Аднак, сэрца яго не кранулася. Такім парадкам адразу відаць, што тут не думка аб дачцы, а звычайная скнарыстасць, грошы дзеля грошай. Арцёмава душа сапсавана старым светам.

У аповесці цікава і глыбока ўскрыта псіхалогія гэтага чалавека. Праўдзівыя карціны чалавечых перажыванняў праходзяць перад чытачом. У Арцёмавай душы адбываецца змаганне, глыбока затоены ў сабе канфлікт. З аднаго боку, ён бачыць, што калі ён сам забыўся ў кааператыве на стале грошы, хлапчук гэтыя грошы панёс яму наўздагон. Ён бачыць, што сумленнасць і шчырасць сталі ўласцівасцю людзей, якія яго абкружаюць. Нарэшце, гарт яго пачуццяў даходзіць да свайго кульмінацыйнага пункту, калі яму падлічваюць працадні і ён бачыць, што нават з аднаго толькі авансу можна добра жыць. Ён адчувае, што на свеце стала штосьці інакшае, што ў такой важнай для чалавека справе, як шлюб, людзей не цікавіць пасаг. Чалавек узнімаецца, як каштоўнасць сама па сабе. І ў той-жа час несвядомае імкненне да ўтайкі грошай не пакідае Арцёма. Ён пачынае мучыцца. Калі яго клічуць у сельсовет, каб выдаць аванс, ён думае, што гэта яго хочуць арыштаваць. Ён дрыжыць, калі ўсе навакол радуюцца. І, нарэшце, ён не вытрымаў. Яго пачынае мучыць сумленне. Ён надумаўся аддаць грошы і рад, што Марына ідзе замуж за Алеся.

Нават і без гэтай справы з грашыма скнарыстасць бацькі, як рыса яго натуры, не падабаецца Марыне. Яна бачыць, што ён добрыя боты, скажам, трымае ў схованні, а начамі слепіцца пры газоўцы, ладзячы нейкія недатопкі. І ўсё гэта спрыяе канфлікту.

Есць у аповесці персанаж Саўка, вобраз супроцьлеглы Арцёму. Гэта ясная натура, аптыміст. Скончыўшы працу, ён ідзе паслухаць музыку і паглядзець, як гуляе моладзь. Ён любіць адчуваць на сабе чыстае адзенне і за гэта Арцём трымае ў сваёй душы да яго непрыязнь. Ён думае: пасвіць коні трэба ў бруднай рубашцы.

Узаемадачыненні паміж Арцёмам і Саўкам у аповесці не разгорнуты ў вострым знадворным канфлікце. Саўка існуе ў творы як нейкае Арцёмава сумленне, як сімвал таго боку Арцёмавай душы, дзе шырыцца тое новае, якое ў канцы аповесці топча пад ногі чарнату яго скалечанай старым светам душы. Вядома, аповесць толькі выйграла-б, каб аўтар звёў гэтых двух сваіх персанажаў у дзейсным вонкавым канфлікце. Гэты момант творчасці павінен цікавіць аўтара ў яго творчай вучобе. Але ў гэтым выпадку гаворыцца пра тое, што малады аўтар стварыў два цікавыя чалавечыя вобразы.

Аўтар адчувае сілу і значэнне тых сродкаў, якія ўваходзяць у арсенал зброі празаіка. Аўтар ведае, што такое гумар у народнай мове, таксама як адчувае лірычны струмень у мове. Калі Саўка расказвае аб тым, як ён ехаў на курорт, то ўжо тут чуецца тып, які сам раскрывае сябе праз свае словы. Жартаўлівасць і лірычная журботнасць, гумар з нахілам у некаторую гіпербалічнасць — вось сродкі, якімі аўтар надзяліў свайго тыпа. Вось ён едзе ў поездзе. «Як губернатар які сяджу, людзі паважна глядзяць на мяне і ветліва загаварваюць... Ну, вядома-ж, абы каго ў поезд не пасадзяць». Ведае ён добра, што ўсе ў поездзе ездзяць, але яго жыццёрадаснасць і прыродны аптымізм не могуць дазволіць яму трымацца ў расказе толькі натуральнага факта.

Слабейшымі выйшлі ў аповесці вобразы Марыны і Алеся. Да некаторай ступені яны абодва ёсць толькі катэгорыі пэўных ідэй, а не ва ўсёй паўнаце сваёй жывыя персанажы мастацкага твора. Аўтар найбольш раскрывае іх праз свае рэмаркі, а не праз бытавыя дэталі, як Арцёма і Саўку. Гэтыя два вобразы выйшлі-б як больш закончаныя характары, яркія тыпы нашай моладзі, каб аўтар усіх чатырох герояў аповесці больш дзейсна звёў у адзіным канфлікце, які ёсць аснова аповесці. Уся структура аповесці так цікава аўтарам пабудавана, што гэта можна было-б лёгка зрабіць.

Аповесць «Каханне» цікавая тым, што аўтар у аснову яе паклаў абрысоўку чалавечых характараў праз канфлікт, праз канкрэтныя і важныя падзеі. У гэтым кірунку аўтару трэба і далей удасканальвацца.

І яшчэ: аўтару трэба дамагацца прастаты і выразнасці ў кожнай фразе, у кожным слове, таксама, як і не дапускаць у свой стыль элементаў сантыменталізма. «Цёплы сонечны праменьчык пяшчотна казытаў шчаку». Гэта гучыць больш чым прыкра. Гэта рэшткі дрэнных уплываў сантыментальнага стылька, які калісьці вельмі задзёрыста стараўся падняць галаву ў нашай літаратуры і з якім так цяжка было змагацца.

У аповесці «Каханне» ляжыць суровы стыль. Гэта той стыль, які заўсёды дазваляў майстрам літаратуры ствараць чалавечыя вобразы. Гэты стыль не можа мець у сабе нават самых найменшых элементаў сантыменталізма. Сантыменталізм гучыць як фальш. Аповесць «Каханне» паказвае, што аўтар яе адчувае гэта, і элементы фальшывых стыляў у аповесці ёсць толькі рэшткі кніжных уплываў.

Аповесць «Каханне» цікавая вырысаванымі ў ёй чалавечымі характарамі і тым канфліктам, з якога яны паўстаюць і якi служыць фабулай усяго твора.

*) З даклада на пленуме Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Пісьменнікі—у перадвыбарчай кампаніі

Пісьменнікі і паэты гор. Менска прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Да сёнешняга дня членамі Саюза совецкіх пісьменнікаў напісана каля 90 нарысаў аб кандыдатах у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, 14 вершаў, 5 аднаактных п'ес, літаратурны мантаж, буйны вершаваны твор «Радзіме і правадыру», нарысы «Менск», «Магілеў» і «Віцебск» і інш. Група пісьменнікаў прыняла ўдзел ў стварэнні кнігі «Беларусь Совецкая».

Семнаццаць пісьменнікаў і паэтаў выступалі з чыткай сваіх твораў на дванаццаці перадвыбарчых сходах на выбарчых участках і прадпрыемствах.

ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА ДА ВЫБАРАЎ

З вялікім творчым уздымам калектыў Дзяржаўнага тэатра юнага гледача рыхтуецца да гістарычнага свята — выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Да гэтай знамянальнай даты тэатр выпусціў спектакль аб зараджэнні стаханаўскага руху на Данбасе «Ноч у верасні» І. Чэкіна (у пастаноўцы засл. арт. А. Міровіча), а таксама падрыхтаваў інтэрмедыю, прысвечаную першаму кандыдату, лепшаму другу беларускага народа, творцу Канстытуцыі СССР — таварышу Сталіну.

Сваімі спектаклямі і канцэртамі тэатр абслужыў 14 перадвыбарчых сходаў выбаршчыкаў Кагановіцкай і Дзяржынскай акруг і даў спектакль маладым выбаршчыкам Кагановіцкага раёна. На час выбараў тэатр прымацаван да Дзяржынскай выбарчай акругі, дзе ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР балатыруецца бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна — таварыш Молатаў. Апрача культурна-мастацкага абслугоўвання выбаршчыкаў гэтай акругі, партыйная і комсамольская арганізацыі тэатра вылучылі пяць агітатараў для правядзення прапагандысцкай работы на ўчастках акругі.

24 чэрвеня тэатр удзельнічае ў гарадской палітмасоўцы, дзве актары тэатра будуць выступаць на адкрытых пляцоўках з канцэртамі, наладжваць масавыя гульні і танцы.

Да 26 чэрвеня тэатр афармляе дзве аўтамашыны, на якіх будуць раз'язджаць дзве брыгады актораў па ўчастках Дзяржынскай і Кагановіцкай выбарчых акруг. У гэты дзень тэатр дасць не менш шасці выступленняў.

Шырока разгорнута палітмасавая работа ўнутры калектыва тэатра. Створаны і працуюць тры гурткі па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» і Канстытуцыі БССР. Выпушчана два нумары насценгазеты і нумар фотагазеты, прысвечаныя выбарам у Вярхоўны Совет БССР. Праведзена гутарка аб Сталінскай Канстытуцыі і совецкай моладзі, заслухан даклад аб міжнародным становішчы.

В. С.

Бібліяграфія

П'ЕСЫ ДА ВЫБАРАЎ

(К. ЧОРНЫ—„Базылевічава сям'я“, І. ГУРСКІ—„На варце“, Е. РАМАНОВІЧ—„Літаратурна-вакальны мантаж“, ДВБ, 1938)

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выдала серыю аднаактных п'ес да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. П'есы разлічаны на пастаноўку іх самадзейнымі гурткамі. Яны прапагандуюць Сталінскую Канстытуцыю, совецкі выбарчы закон, паказваюць з'яднанасць нашага народа вакол комуністычнай партыі і правадыра працоўных усяго свету вялікага Сталіна. Драматургі ў сваіх п'есах мабілізуюць рэволюцыйную пільнасць гледача і паказваюць адзінства і маналітнасць нашага народа ў барацьбе з фашысцкімі шпіёнамі.

Дзея п'ес Чорнага і Гурскага адбываецца ў калгасах пагранічнай зоны. Базылевічы і Рыгор Прановіч («Базылевічава сям'я»), свінарка Домна і яе дзеці («На варце») — гэта совецкія патрыёты, калгаснікі, актыўныя памочнікі пагранічных войск НКВД у барацьбе з шпіёнамі і дыверсантамі. Аўтары п'ес пераканаўча даводзяць, што совецкая разведка, якая абапіраецца на мільёны совецкіх патрыётаў,—самая сільная і непераможная разведка ў свеце.

К. Чорны паказвае шчаслівую сям'ю совецкіх патрыётаў, якая складаецца з перадавых людзей—ваеннага інжынера Мікалая, настаўніцы Веры і студэнта-медыка Леаніда, мастацка даводзячы, што толькі пры совецкай уладзе дзеці беднага селяніна маглі авалодаць вышынямі навукі і культуры.

І. Гурскі ў п'есе «На варце» рысуе жорсткую класавую барацьбу паміж калгаснікамі і хітра замаскіраванымі знешнімі і ўнутранымі ворагамі народа. Вобраз даяркі Галіны, якая класавым чуццём знайшла сляды ворага, пакідае добрае ўражанне. У вобразе Пятруся Порхаўкі драматург спрабуе паказаць, як ворагі скарыстоўваюць у сваіх подлых мэтах няўстойлівых і хісцкіх людзей.

П'есы К. Чорнага і І. Гурскага напісаны простай і лёгкай мовай. Яны не складаныя ў сэнсе сцэнічных запатрабаванняў і могуць быць пастаўлены кожным драмгуртком на любой сцэнічнай пляцоўцы.

Вельмі карысны для мастацкай самадзейнасці літаратурна-вакальны мантаж Е. Рамановіча, які пабудаван на матэрыялах «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» і вершах Янкі Купалы і Якуба Коласа, пакладзеных на музыку беларускімі кампазітарамі.

Там, дзе ёсць вакальны і драматычны гурток, літаратурна-вакальны мантаж Е. Рамановіча можа быць скарыстан з вялікім поспехам.

Дадатная вартасць усіх п'ес у тым, што яны не трацяць сваёй актуальнасці і пасля выбарчай кампаніі.

Выданне п'ес для мастацкай самадзейнасці — добры пачатак Выдавецтва Беларусі.

М.

НА ЦЫРКАВОЙ АРЭНЕ

(Менскі Дзяржцырк)

За апошнюю дэкаду, асвежаная новымі нумарамі, цыркавая праграма прыкметна палепшылася, стала мастацка больш поўнакроўнай і добра прымаецца гледачом. Праўда, яшчэ застаецца пэўнае ўражанне аб выпадковым падборы нумароў праграмы. Гэта асабліва адчувалася ў першай дэкадзе, пры адкрыцці цыркавога сезона.

Совецкі цырк ва ўмовах нашага радаснага жыцця займае адно з ганаровых месц у дзяржаўнай сістэме відовішчаў. Любімы народам, ён прыцягвае да сябе масавага гледача. Глядач-жа ў сваю чаргу стаў культурным, патрабавальным, а адсюль і высокі попыт на першакласнае выкананне асобных нумароў і ўсёй праграмы ў цэлым.

Як ні дзіўна, дрэсіраваныя коні ўжо даўно перасталі быць галоўным нумарам цыркавога прадстаўлення. Можа быць, гэта залежыць ад таго, што з некаторага часу гэтаму жанру цыркавой праграмы мала аддаецца ўвагі. Пры бліскучай тэхніцы іншых жанраў, работа са зменай коней на манежы цырка не расце, не павышаецца ў тэхніцы. У гэтым у першую чаргу вінаваты самі дрэсіроўшчыкі. Работа коней пад кіраўніцтвам Хурсанова якраз сведчыць аб тым, якім нецікавым і толькі чыста «афіцыяльна-абавязковым» у праграме можа быць такі нумар. Аднастайны, шаблонны паркур манежа, адсутнасць рэжысёрскай выдумкі, штамп,—калі і не наводзяць нуду, дык ва ўсякім выпадку казённыя.

Радуе група маладых акрабатаў Жэрве (між іншым, чаму «Жэрве»? — што за пагоня за старымі цыркавымі псеўдонімамі!) Жвавасць, спрытнасць і лёгкасць — усё гэта дэманструецца маладымі акрабатамі-прыгунамі і робіць добрае ўражанне. Але нумар яшчэ сыры, канчаткова не адшліфаваны.

Работа пад купалам трох Осіпавых можа быць аднесена да лепшых нумароў праграмы. Пачынаючы з канструкцыі пабудовы выступлення і канчаючы тэхнікай выканання, выступленні Осіпавых арыгінальныя па смеласці, цікавыя, пакідаюць добрае ўражанне.

Калі ацэньваць работу Рэйн (эквілібрысты на першах), дык трэба сказаць, што гэта лепшы і сапраўды цыркавы, бліскучы па тэхніцы нумар усёй цыркавой праграмы, — нумар, па якому павінна раўняцца ўся праграма цырка. Бліскучая выдумка тут спалучаецца з высокім цыркавым выкананнем, смеласцю, разумным трукавым разлікам.

Вядомы музыкальны сатырык Тамарын, на вялікі жаль, пры ўсіх магчымасцях творчага росту, вось ужо год як стаіць на месцы. Глядач управе патрабаваць ад гэтага здольнага эксцэнтрыка новага.

Аб Роберце і Хронусаве можна сказаць толькі тое, што іх «антрэ», як і выступленне крафт-акрабатаў Югавых, не пакідаюць ніякага ўражання.

Высокі па тэхніцы мнематэхнічны нумар «Эмма-Фор», але гэта выступленне больш эстраднага ці мюзікхольнага плана, чымсьці цыркавога манежа.

Вельмі цікавая работа на манежы Маншылінай з дрэсіраванымі сабачкамі, як сведчанне мяккай дрэсіроўкі, агульнай прадуманасці выступлення і добрасумленнай якасці.

Жанглёр Махлін — адзін з вядомых у СССР жанглёраў, у прынцып работы якіх пакладзена толькі імкненне да сапраўднага майстэрства жангліравання, без якіх-небудзь прэтэнзій на танныя «сногсшибательные» эфекты. Альберт Махлін са сваімі лепшымі нумарамі ўваходзіць арганічна ў праграму цырка.

Ілюзіяніcцкія атракцыёны «з асістэнтамі» ў нас да гэтага часу прынята разглядаць, як «можна і без іх», але і ў праграме яны «не перашкаджаюць». Некалькі інакш трэба разглядаць выступленне Марчэс. Па-першае, увесь нумар пабудаван без прэтэнзіі выклікаць неразуменне гледача «спрытнасцю факіра», а, па-другое, — нумар прасякнут жаданнем выканаўцаў зрабіць яго вясёлым і забаўляючым. Пры дапамозе вялікага майстэрства маніпуляцыі, добрага рэквізіту трупа Марчэс гэтага дамаглася. Выступленне іх і культурнае і вясёлае, задавольвае гледача цалкам.

Клоун Сенічка Рэдзькін, як амплуа,— з'ява ў цырку новая. Яго работа не носіць слядоў заштампаванасці, але пры некаторых станоўчых якасцях у ёй ёсць і рэшткі старога цыркавога «хохмачества», не заўсёды добраякаснага.

Шмат хочацца пажадаць аркестру, які да гэтага часу яшчэ не зусім сыграўся. Дырэкцыя Менскага Дзяржцырка, сур'ёзна заклапочаная падборам для сталічнага цырка найбольш высокаякасных нумароў цыркавога майстэрства, павінна зрабіць праграму больш рознастайнай, павінна часцей мяняць яе.

Улад. МУРАТ.

ВЕЧАР ПАМЯЦІ А. М. ГОРКАГА

18 чэрвеня адбыўся гарадскі вечар памяці вялікага пролетарскага пісьменніка Аляксея Максімавіча **Горкага**, два годы таму назад злачынна ўсмерчанага ворагамі рабочага класа.

У вечары прынялі ўдзел стаханаўцы фабрык і заводаў, партыйна-комсамольскі актыў і пісьменнікі Совецкай Беларусі.

Даклад пра жыццё і творчасць А. М. Горкага зрабіў крытык А. Кучар. Пасля даклада з успамінамі пра А. М. Горкага, пра свае сустрэчы з вялікім пісьменнікам расказаў народны паэт рэспублікі Якуб **Колас**. З чыткаю вершаў, прысвечаных памяці А. М. Горкага, выступалі паэты **П. Броўка, П. Глебка, М. Калачынскі, Э. Агняцвет, Камянецкі, Ліўшыц, Мальцінскі** і інш.

**

У дзень другой гадавіны з дня смерці А. М. Горкага вечар памяці буравесніка пролетарскай рэволюцыі быў праведзены ў Доме асветы. Пра жыццёвы шлях і барацьбу за ўрачыстасць соцыялізма, пра велізарную літаратурную спадчыну Горкага зрабіў даклад М. **Ларчанка**.

Совецкія пісьменнікі БССР выказваюць сваё глыбокае спачуванне паэту **Зэліку Аксельроду** з прычыны смерці яго **МАЦІ**.

М. Лынькоў, Г. Камянецкі, К. Чорны, М. Дзехцяр, М. Клімковіч, С. Каган, П. Броўка, Х. Мальцінскі, Э. Самуйлёнак, М. Груб'ян, А. Кучар, П. Глебка, Р. Боймвол, І. Гурскі, Г. Бярозкін, З. Бядуля, Э. Каган, М. Ліўшыц, А. Платнер, Р. Рэйзін, І. Сярэбраны, З. Целесін, Л. Талалай, У. Фінкель, Г. Шведзік.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г—4699.